Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «ВЕДАЙ І ЛЮБІ СВОЙ ГОРАД»**

*Да 80-годдзя Вялікай Перамогі*
*Да Дня горада Кобрына*

# Вуліцы подзвігу і славы

## ДАВЕДНІК

***па вуліцах Кобрына, якія носяць імёны ГЕРОЯЎ – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны***

Кобрын
2025

УДК 016:[908(476.7)(092)+929
ББК 91.9:63.3(4Беи)+95
В88

***Складальнік***
С. Д. Курачук - бібліёграф І катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

В88 **Вуліцы подзвігу і славы** : даведнік па вуліцах Кобрына, якія носяць імёны герояў - удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2025. – 88 с. : фат. – (Серыя «Ведай і любі свой горад»).

Даведнік з серыі «Ведай і любі свой горад» выходзіць да 80-годдзя Вялікай Перамогі і да Дня горада Кобрына. Мэта выдання - абудзіць гістарычную памяць моладзі, спрыяць павышэнню духоўнасці, грамадзянскасці і патрыятызму. Разлічаны на шырокае кола чытачоў, моладзь.

**УДК 016:[908(476.7)(092)+929**
**ББК 91.9:63.3(4Беи)+95**

© ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», 2025

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Прайшло 80 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але памяць пра вайну і пераможцаў ніколі не згасне ў сэрцах беларускага народа. Час не ўладны аддаць забыццю, зменшыць веліч подзвігаў герояў вайны. Некаторыя з іх вярнуліся да нас у назвах вуліц быццам жывыя сведкі подзвігу, мужнасці, самаахвяравання.

Даваць вуліцам імёны герояў - даўняя традыцыя. Напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі Нацыянальнае кадастравае агенцтва, аператар рэестра адрасоў, падлічыла, колькі вуліц у Рэспубліцы Беларусь названы ў гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны. Усяго ў рэестры адрасоў змяшчаецца 3.266 вуліц, назвы якіх нясуць даніну павагі вялікім подзвігам нашых продкаў і тым, каго мы сёння дзякуем за мірнае неба.

Удзячная памяць захавала такія імёны і ў нашым горадзе. У Кобрыне налічваецца **23** вуліцы, звязаныя з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Адны з іх названы ў гонар афіцэраў, салдат, іншыя нагадваюць аб партызанах і падпольшчыках. Большасць назваў гэтых вуліц з'явіліся адразу ў пасляваенны перыяд, некаторыя з іх - параўнальна нядаўна. Размешчаны вуліцы ў асноўным у паўночнай і паўднёва-ўсходняй частцы горада.

Кабрынчане свята шануюць памяць аб усіх тых, хто цаной уласнага жыцця, здароўя падарыў нам дабрабыт і шчасце і бясконца ўдзячныя ім за мужнасць і нязменную веру ў Перамогу. У назвах вуліц, завулкаў горада ўвасоблены вялікі подзвіг франтавікоў - абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Выданне складаецца з двух раздзелаў. Раздзел «*Не згасне агонь памяці*» прадстаўляе вуліцы ў гонар асоб, звязаных з горадам Кобрынам: тых, хто нарадзіўся, жыў у Кобрыне, удзельнічаў ў абароне або вызваленні горада і г. д. Другі раздзел «*На карце горада герояў імёны*» расказвае аб

вуліцах у гонар герояў Вялікай Перамогі – агульнавядомых персаналіях, не звязаных напрамую з Кобрынам. Апісаннем кожнай вуліцы з'яўляецца інфармацыя пра асобу, у гонар якой названа вуліца, ёсць фотаздымкі, схемы вуліц, адзначаны даты прысваення вуліцам імён герояў Вялікай Айчыннай.

Даведнік «Вуліцы подзвігу і славы» з серыі «Ведай і любі свой горад» выходзіць з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі да Дня горада Кобрына. Мэта выдання - абудзіць гістарычную памяць моладзі, спрыяць павышэнню духоўнасці, грамадзянскасці і патрыятызму. Захаванне памяці аб вайне ў назвах вуліц з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных шляхоў увекавечання подзвігу народа, асэнсавання і трансляцыі гістарычнай праўды. Героі адыходзяць, але іх імёны працягваюць жыць у назвах вуліц і, такім чынам, у памяці людзей, якія на іх жывуць, у памяці кожнага новага пакалення нашчадкаў Перамогі.

Даведнік разлічаны на шырокае кола чытачоў, моладзь.

Пры падрыхтоўцы выдання выкарыстаны дакументы Занальнага дзяржаўнага архіва г. Кобрына, матэрыялы Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, геаінфармацыйная сістэма - Публічная кадастравая карта (ПКК), інфармацыйна-бібліяграфічныя выданні бібліятэкі.

**Мы, хутчэй за ўсё, апошняе пакаленне, якое бачыла жывых ветэранаў, таму павінны свядома, з павагай падысці да таго, каб захаваць памяць аб вялікіх салдатах Айчыннай вайны. Сённяшняе і будучае пакаленні павінны памятаць тых, хто абараняў краіну і захаваў мір на зямлі. Памяць - гэта звяно паміж мінулым і будучым. Яна заклікае, пераконвае і перасцерагае, дае сілы і выклікае веру, з яе мы чэрпаем сілы для новых здзяйсненняў.**

# НЕ ЗГАСНЕ АГОНЬ ПАМЯЦІ

## памяць аб ГЕРОЯХ, імёны якіх звязаны з КОБРЫНАМ, ушанаваная ў назвах ВУЛІЦ



# Вуліца ГЕТМАНА




Імя нашага земляка Паўла Сцяпанавіча Гетмана прысвоена адной з вуліц горада Кобрына па рашэнні сесіі Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 12 кастрычніка 2005 года.



**Гетман Павел Сцяпанавіч (1925–1944) – удзельнік падпольнага руху на Кобрыншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

Нарадзіўся ў 1925 годзе ў вёсцы Патрыкі Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Вучыўся ў гімназіі, адзінай на той час сярэдняй вучэбнай установе на ўвесь Кобрынскі павет (цяпер

сярэдняя школа № 1 г. Кобрына). Закончыў шэсць класаў школы. Павел добра спяваў, танцаваў і запомніўся педагогам і аднагодкам як здольны вучань і актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці.

Уваходжанне Заходняй Беларусі ў склад БССР адкрывала перад моладдзю заходніх абласцей шырокія магчымасці. Пасля верасня 1939 года Павел уступіў у камсамол, напэўна будаваў планы, звязаныя з далейшай вучобай або працай. Але ўсё змяніла вайна. Каб не адправілі ў Нямеччыну, Павел уладкаваўся на Кобрынскі рамонтны завод трактарыстам. Ён стаў актыўным удзельнікам падпольнага руху. Па заданні падполля юнак быў устроены на работу ў гебітскамісарыят - галоўны орган акупацыйнай улады, на чале якога стаяў нацыст па прозвішчы Панцыр. Будучы асабістым шафёрам гебітс-камісара, па заданні падпольшчыкаў Павел Гетман распачаў спробу падарваць свайго начальніка пры дапамозе магнітнай міны з гадзіннікавым механізмам.

Малады падпольшчык двойчы праводзіў дыверсію, але беспаспяхова. Пробы знішчыць гебітскамісара прывялі да таго, што за Паўлам сталі сачыць. Заўважыўшы гэта, ён вырашыў бегчы ў лес да партызанаў, аднак недалёка ад горада быў схоплены фашыстамі і змешчаны ў кобрынскую турму. Ішоў 1944 год, і да вызвалення Кобрына заставалася некалькі месяцаў. Патрыёта па-зверску катавалі, патрабавалі, каб ён выдаў тых людзей, якія далі яму заданне. «Памру, але нікога не выдам», - такімі былі апошнія словы маладога чалавека. Пасля доўгіх пытак наш зямляк быў затраўлены галоднымі сабакамі ва двары кобрынскай турмы, прыняў пакутніцкую смерць ад ворага.

# Вуліца ДАНІЛЕЎСКАЙ




Гэту назву вуліца атрымала 15 мая 1963 года. Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 199 вуліца Новая ў Кобрыне перайменавана ў вуліцу Данілеўскай Алісы Фёдараўны. З 2008 года – вуліца Данілеўскай (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008). Знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.



**Данілеўская Аліса Фёдараўна (22.08.1893 – 04.05.1944) – удзельнік падпольнага руху на Кобрыншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

Нарадзілася 22 жніўня 1893 года ў Кіеве. Там закончыла жаночую гімназію, дзе ў дасканаласці вывучыла нямецкую мову.

У лістападзе 1943 года гітлераўцы вывозілі жыхароў з Кіева на работу ў Германію. З-за дыверсіі партызан на чыгунцы эшалон, у якім везлі Алісу Данілеўскую і іншых, спыніўся непадалёку ад Кобрына. Іх пакінулі на прымусовыя работы, пасяліўшы ў вёсцы Малыя Лепясы, што побач з горадам. Дзякуючы добраму веданню нямецкай мовы, А. Данілеўскую ўзялі на працу ў штаб нямецкай танкавай часткі, якая размяшчалася на тэрыторыі сучаснага ваеннага гарадка. Хутка туды ўдалося ўладкаваць і Людмілу Біхерт.

Зімой 1944 года праз падпольшчыкаў-чыгуначнікаў з жанчынамі быў устаноўлены кантакт нашых разведчыкаў. Яны згадзіліся дапамагчы правесці дыверсію і ўзарваць штаб.

24 красавіка 1944 года ў будынку штаба праходзіла ваенная нарада. Сабралася шмат гітлераўскіх афіцэраў. Аліса Данілеўская і Людміла Біхерт выканалі заданне. Магутны выбух знішчыў штаб разам з усімі гітлераўцамі, што там знаходзіліся. Акупанты схапілі адважных патрыётак, але, нягледзячы на жорсткія катаванні, яны нікога не выдалі. 4 мая 1944 года, калі да выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў з кобрынскай зямлі заставалася менш як тры месяцы, жанчыны былі павешаны на плошчы Свабоды ў г. Кобрыне.

На кобрынскай зямлі Аліса Фёдараўна Данілеўская зрабіла апошні крок у бессмяротнасць, і невыпадкова адна з гарадскіх вуліц носіць імя адважнай патрыёткі.

# Вуліца ЗАМОРЫНА






**Заморын Іван Аляксандравіч (10.04.1918 – 04.01.1993) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ваенны лётчык, кавалер дзевяці ордэнаў СССР і двух Францыі.**

Нарадзіўся 10 красавіка 1918 года ў в. Касценка Магілёўскай губерні (цяпер Магілёўскі раён Магілёўскай вобласці). Закончыў сем класаў сярэдняй школы. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 13 гадоў матарыстам на швейнай фабрыцы імя Валадарскага ў Магілёве.

Юнакоў 1930-х гадоў вабіла служба ў Чырвонай арміі, а самыя смелыя марылі аб прафесіі лётчыка. Яшчэ ў школе Іван пачаў наведваць Магілёўскі аэраклуб. У 19 гадоў закончыў вучобу ў аэраклубе, затым быў залічаны ў Барысаглебскую Чырванасцяжную ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў імя В. П. Чкалава. З 1938 года ў Чырвонай арміі. У 1941 годзе прайшоў 4-х месячныя курсы камандзіраў звенняў пры 29-й авіядывізіі Далёкаўсходняга фронту.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны малодшы лейтэнант Іван Заморын у дзеючай арміі. Да чэрвеня 1942 года ваяваў у складзе 168-га знішчальнага авіяцыйнага палка, з чэрвеня 1942 года па студзень 1944 года камандаваў 2-й эскадрылляй 18-га гвардзейскага знішчальнага авіяпалка.

18-ы полк праславіўся тым, што ваяваў разам са славутым французскім авіяпалком «Нармандыя – Нёман». Нашаму герою давялося правесці шмат паветраных баёў разам з французскімі лётчыкамі, поплеч з імі змагацца супраць фашысцкіх захопнікаў. Не раз асабісты прыклад лётчыка-знішчальніка І. А. Заморына станавіўся ўрокам вядзення паветранага бою для французаў. Ужо адзін факт дачынення Івана Заморына да вядомага палку робіць яго асобу легендарнай. Імя І. А. Заморына згадвае французскі пісьменнік Франсуа дэ Жофр у сваёй пасляваеннай кнізе ўспамінаў, якая выдавалася і ў СССР; а ў тытрах дакументальна-мастацкага фільма «Нармандыя – Нёман» паказана: «лётчык Іван Заморын – артыст Зыкаў».

Іван Заморын віртуозна валодаў тэхнікай пілатавання, страляў па-снайперску, у баі дзейнічаў разважліва.

Лятаць з ім лічылася вялікім гонарам і добрай школай. За час вайны ён асвоіў некалькі тыпаў баявых самалётаў, у тым ліку і нямецкі Ме-109.

Усяго за гады вайны лётчык-знішчальнік Іван Заморын правёў 342 паспяховых баявых вылетаў, 9 варожых самалётаў было збіта ім асабіста і 12 – у групе. Па словах камандзіра 303-й знішчальнай дывізіі Героя Савецкага Саюза генерал-маёра авіяцыі Г. Н. Захарава, лётчык Заморын меў каля 20 асабістых перамог, але з-за сваёй сціпласці ніколі не настайваў на занясенні многіх збітых самалётаў праціўніка на свой асабісты рахунак. У пытаннях асабістага рахунку лётчык быў да крайнасці педантычны: лічыў збітымі толькі тыя самалёты, што ўпалі на яго вачах і чыё месца падзення ён мог бы дакладна паказаць на карце.

У жніўні 1942 года ў адным з цяжкіх баёў самалёт Івана Заморына быў падбіты, лётчыка напаўжывым выцягнулі з самалёта, ён атрымаў вялікія апёкі твару, рук і ног. Некалькі месяцаў правёў у шпіталях. Медыцынская камісія хацела спісаць яго з лётнай работы, аднак І. А. Заморын настойліва, пераадольваючы боль, распрацоўваў свае пашкоджаныя рукі і дабіўся свайго. Праз некалькі месяцаў вярнуўся ў полк, на новых баявых машынах зноў падняўся ў неба і правёў яшчэ шмат выдатных паветраных баёў.

Знакамітага лётчыка Івана Заморына двойчы прадстаўлялі да прысваення звання Героя Савецкага Саюза, якое ён так і не атрымаў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў паветраных баях на Курскай дузе, капітан І. А. Заморын быў прадстаўлены да звання Героя

Савецкага Саюза. Аднак на другі дзень у адным з баявых вылетаў загінуў першы камандзір французскай эскадрыллі Жан Цюлян (камандаваў сумесным палётам Іван Заморын). З-за гібелі Жана Цюляна прадстаўленне не адбылося.

Другі раз аб узнагароджанні Івана Заморына высокім званнем хадайнічаў камандзір палка падпалкоўнік Анатоль Голубаў. Хадайніцтва падтрымалі камандзір дывізіі генерал-маёр Г. Захараў, камандуючы 1-й паветранай арміі генерал-лейтэнант М. Громаў, камандуючы Заходнім фронтам генерал арміі В. Сакалоўскі. Аднак і на гэты раз Івану Заморыну не пашанцавала. Гісторыя – амаль аналагічная той, што была з французамі. Толькі цяпер загінуў Леанід Хрушчоў – сын члена Палітбюро Мікіты Хрушчова.

І. А. Заморын меў шмат урадавых узнагарод. Франтавы шлях лётчыка-знішчальніка адзначаны 20 падзякамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І. В. Сталіна, пяць з іх лётчык атрымаў за вызваленне Беларусі. У студзені 1944 года Іван Заморын стаў штурманам дывізіі, лятаў у пары з генералам Г. Захаравым. З лютага 1944 года па студзень 1945 года ён быў штурманам 303-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі. Многія паветраныя баі, праведзеныя з удзелам лётчыка Івана Заморына, увайшлі ў летапіс гісторыі савецкай авіяцыі.

Закончыў вайну Іван Аляксандравіч Заморын падпалкоўнікам, камандзірам 523-га знішчальнага Аршанскага Чырванасцяжнага ордэнаў Суворава, Кутузава і Аляксандра Неўскага авіяцыйнага палка. Пасля вайны да

самага пенсійнага ўзросту Іван Аляксандравіч служыў у авіяцыі.

Выхадзец з Магілёўскай вобласці, упершыню лётчык Заморын апынуўся ў нашым горадзе пасля вайны, калі 523-ці знішчальны авіяцыйны полк 303-й знішчальнай авіядывізіі 1-га паветранага войска Баранавіцкай, а пазней Беларускай ваеннай акругі дыслацыраваўся ў Кобрыне. У Кобрыне Іван Аляксандравіч правёў і два апошнія дзесяцігоддзі свайго жыцця. Падцягнуты, ветлівы, сціплы і нешматслоўны – не кожны з першага погляду прызнаваў у гэтым чалавеку героя Вялікай Айчыннай вайны. І толькі ў асабліва ўрачыстых выпадках Іван Аляксандравіч апранаў парадны мундзір палкоўніка авіяцыі – і тады кожны жыхар нашага горада, заўважыўшы шматлікія ўзнагароды ветэрана і сляды апёкаў на твары і руках, разумеў, што гэты чалавек шмат чаго перанёс у сваім жыцці.

На пенсіі легендарны лётчык займаўся патрыятычна-выхаваўчай работай, за што атрымаў Ганаровую грамату Савецкага камітэта ветэранаў. Ён сустракаўся з моладдзю, часта бываў у школах, дзе расказваў падрастаючаму пакаленню аб былых баях, вучыў іх быць сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы.

У Кобрыне Іван Аляксандравіч жыў разам з жонкай. Наведаць бацькоў нярэдка прыязджала з Калінінграда дачка з унукамі. Ветэран не губляў сувязі з франтавымі сябрамі, савецкімі і французскімі, ездзіў у Маскву на сустрэчы ў юбілеі Вялікай Перамогі.

Ваенны лётчык Заморын - кавалер дзевяці ордэнаў СССР і двух Францыі. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях у гады Вялікай Айчыннай вайны І. А. Заморын

узнагароджаны ордэнам Леніна (29.06.1945), трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга (10.12.1942, 19.02.1944, 06.11.1944), ордэнамі Аляксандра Неўскага (27.08.1943), Айчыннай вайны II ступені (27.02.1943), Айчыннай вайны I ступені (11.03.1985), двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Пасля вайны беларускі лётчык Іван Заморын быў узнагароджаны французскім «Ваенным крыжом» (20.05.1945) і ўдастоены ордэна Ганаровага легіёна (21.11.1984) – вышэйшай узнагароды Францыі. Яе Івану Аляксандравічу асабіста ўручыў прэзідэнт Францыі Франсуа Мітэран у Крамлі ў азнаменаванне 40-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне.

Іван Аляксандравіч Заморын памёр 4 студзеня 1993 года, пахаваны на гарадскіх могілках. Легендарны лётчык знайшоў вечны спакой на кобрынскай зямлі, назаўжды ўпісаўшы свае слаўнае імя ў яе гісторыю.



8 мая 2005 года на доме № 1 па вуліцы Пушкіна, дзе з 1974-га па 1993 год жыў І. А. Заморын, была ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

# Вуліца КІРМАНОВІЧА




12 кастрычніка 2005 года на сесіі Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў было прынята рашэнне аб прысваенні вуліцы ў квартале індывідуальнай застройкі па вуліцы Леніна (былы аэрадром) імя земляка-героя, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра Кірмановіча.



**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч (05.11.1919 – 05.02.2001), ураджэнец Кобрына, Герой Савецкага Саюза (1945), палкоўнік, Ганаровы грамадзянін горада Кобрына (1987).**

Лёс моцна звязаў яго жыццё з нашым горадам з самага нараджэння. Нарадзіўся 5 лістапада 1919 года ў г. Кобрыне Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых.

У 1926 годзе хлопчык паступіў вучыцца ў Кобрынскую павятовую школу (цяпер сярэдняя школа № 2 г. Кобрына). Пасля заканчэння сямігодкі Уладзіміра, як дзіця з беднай сям'і, узялі да сябе на навучанне каталіцкія манахі, якія ў адной з хат па вуліцы Першамайскай арганізавалі сталярную майстэрню.

У 1939 годзе, пасля прыходу ў Заходнюю Беларусь савецкай улады, Уладзіміра Кірмановіча заклікалі ў Чырвоную Армію. Уладзімір восем месяцаў (з кастрычніка 1939 па чэрвень 1940) служыў у Ленінградскай вобласці, удзельнічаў у Фінскай вайне.

Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў у 1942 годзе. З 1943 года – член КПСС.

У гады Вялікай Айчыннай вайны У. М. Кірмановіч камандаваў знішчальнай процітанкавай батарэяй на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах.

22 жніўня 1944 года ў час варожай танкавай атакі батарэя капітана Кірмановіча першая прыняла ўдар, у жорсткім баі падбіла і спаліла 14 варожых танкаў. За гэты подзвіг У. М. Кірмановіч быў удастоены ў 1945 годзе звання Героя Савецкага Саюза.

Шматлікія заслугі Уладзіміра Кірмановіча ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі і шматлікімі медалямі.

Пасля вайны У. М. Кірмановіч пражываў у Аўстрыі і Румыніі. Вярнуўшыся з-за мяжы, нядоўга разам з сям'ёй

жыў у Кобрыне. У 1950 годзе пераехаў у Ленінград, дзе паступіў на курсы падрыхтоўкі ў лётную акадэмію, а потым у ваенна-авіяцыйную акадэмію імя М. В. Фрунзе ў Маскве, якую закончыў у 1955 годзе.

У 1956 годзе, пасля заканчэння вучобы, пераехаў у Харкаў. Жыццё У. М. Кірмановіча ў Харкаве злучана з Харкаўскім вышэйшым ваенным вучылішчам лётчыкаў імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцэўца. У гэтым вучылішчы Уладзімір Мікалаевіч доўгія гады працаваў выкладчыкам на кафедры тактыкі. У 1958 годзе Уладзіміру Мікалаевічу прысвоена званне палкоўніка.

У 1975 годзе ў званні палкоўніка і на пасадзе намесніка начальніка па страявой падрыхтоўцы У. М. Кірмановіча камісавалі. Але сыходзіць на заслужаны адпачынак ён зусім не збіраўся. З 1975 года амаль да смерці палкоўнік у адстаўцы Кірмановіч працаваў у сваім лётным вучылішчы ў лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання.

За 45 гадоў, праведзеных у Харкаве, Уладзімір Мікалаевіч не раз наведваў Кобрын, дзе жылі яго родныя і сябры.

У 1987 годзе У. М. Кірмановічу было прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына (рашэнне Кобрынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 237 ад 15.09.1987).

Герой Савецкага Саюза, першы і адзіны выхадзец Кобрыншчыны, які атрымаў такое высокае званне, палкоўнік У. М. Кірмановіч памёр 5 лютага 2001 года. Заслужаны і адданы вайсковай службе чалавек пахаваны на алеі герояў у Харкаве.

Жыццёвы подзвіг Уладзіміра Мікалаевіча і ў ваенны, і ў мірны час - прыклад беззапаветнага служэння Айчыне, узор для пераймання шматлікім пакаленням кабрынчан.

На малой радзіме У. М. Кірмановіча памятаюць, паважаюць яго імя, навечна захаванае ў назвах вуліц, галерэях Славы, музейных экспазіцыях і простай чалавечай памяці тых, хто яго ведаў.




На будынку сярэдняй школы № 2 г. Кобрына, у якой вучыўся Уладзімір Кірмановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Для Кобрына Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч назаўжды застанецца Ганаровым грамадзянінам і адзіным мясцовым Героем Савецкага Саюза. З пакалення ў пакаленне на Кобрыншчыне перадаецца памяць пра героя, які прымножыў славу нашай зямлі.

# Вуліца КРАЎЧУКА




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 98 ад 6 мая 1965 года вуліцы, размешчанай у паўночнай частцы горада на захад ад вуліцы Кутузава, прысвоена імя партызана Краўчука. З 2008 года вуліца перайменавана ў вуліцу Краўчука (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).



**Краўчук Цімафей Міхайлавіч (01.01.1903 – 19.04.1944) – ураджэнец вёскі Патрыкі Кобрынскага раёна, першы старшыня калгаса на Кобрыншчыне, адзін з арганізатараў падпольнага антыфашысцкага камітэта ў Кобрынскім раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

Нарадзіўся 1 студзеня 1903 года ў вёсцы Турная

Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці).

У час Першай сусветнай вайны быў у бежанстве ў Расіі, прымаў удзел у грамадзянскай вайне.

У гады гаспадарання на нашай зямлі памешчыцка-буржуазнай Польшчы Цімафей Краўчук стаў актыўным барацьбітом за ўз'яднанне з Савецкай Беларуссю. У 1927 годзе Цімафей Краўчук - член КПЗБ.

У 1940 годзе Ц. М. Краўчук арганізаваў першы калгас у Кобрынскім раёне - калгас імя Калініна.

У жніўні 1941 года Цімафей Міхайлавіч быў адным з арганізатараў падпольнага антыфашысцкага камітэта ў вёсцы Турная Кобрынскага раёна. Першы падпольны антыфашысцкі камітэт на Кобрыншчыне быў створаны ў самым пачатку жніўня. Яго ўзначаліў Дзмітрый Барысюк, актыўны падпольшчык перыяду польскай акупацыі. Намеснікам стаў Цімафей Краўчук, які ў 1942 годзе ўзначаліў камітэт.

Звесткі, сабраныя нямецкай службай бяспекі, дапамаглі фашыстам высачыць месцазнаходжанне кіраўніцтва антыфашысцкага падполля. Акцыю па знішчэнні падпольнай арганізацыі ўзначаліў Вільч. Батальён паліцаяў шчыльна акружыў вёску. Завязалася перастрэлка.

19 красавіка 1944 года ў час перастрэлкі з карнікамі загінуў Цімафей Краўчук, які доўга і паспяхова кіраваў барацьбой патрыётаў.

# Вуліца МАРОЗАВА




Імем Героя Савецкага Саюза Арсенія Іванавіча Марозава названы сквер і адна з вуліц г. Кобрына. Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008 года вуліцы на зарэчнай часцы горада прысвоена імя Марозава.



**Марозаў Арсеній Іванавіч (23.01.1922 – 24.06.1944) – удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне, ваенны лётчык, Герой Савецкага Саюза (1945).**

Нарадзіўся 23 студзеня 1922 года ў в. Слабодка, цяпер Калінінскага раёна Цвярской вобласці ў сям'і селяніна. Закончыў сем класаў няпоўнай сярэдняй школы ў сяле

Ільінскае, потым прафтэхвучылішча ў г. Цвер (1938). Працаваў слесарам на Калінінскай прадзільнай фабрыцы і займаўся ў аэраклубе.

З 1940 года - у Чырвонай Арміі. У 1941 годзе закончыў Батайскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў.

З першых дзён вайны Арсеній Марозаў добраахвотнікам пайшоў на фронт. Ён прайшоў шлях ад радавога да намесніка камандзіра авіяэскадрыллі. Ваяваў на Паўднёвым, Заходнім і 1-ым Беларускім франтах. Зрабіў 271 баявы вылет, асабіста збіў 13 самалётаў праціўніка і 9 - у групавых баях. На штурм варожых войскаў зрабіў 32 баявыя вылеты. Знішчыў чатыры варожыя самалёты на аэрадромах, тры чыгуначныя вагоны з боепрыпасамі, 18 аўтамашын з грузам. Удзельнічаў у вызваленні Бабруйска, Слуцка, Баранавіч. А. І. Марозаў быў лепшым лётчыкам корпуса, любімцам палка і дывізіі.

У складзе 149-га Чырванасцяжнага Памеранскага знішчальнага палка, які базіраваўся на Кобрынскім аэрадроме, старшы лейтэнант А. І. Марозаў быў намеснікам камандзіра эскадрыллі. Калі пачаліся баі на подступах да Брэста, ён атрымаў заданне штаба фронту разведаць сілы гітлераўцаў і шляхі іх адступлення.

24 чэрвеня 1944 года пасля паспяховай разведкі, звесткі пра якую ён перадаў па радыё, А. І. Марозаў вяртаўся на аэрадром, але ўбачыўшы вялікую колькасць варожай тэхнікі і войск, папрасіў дазволіць штурм. Уступіў у бой з групай варожых самалётаў, быў падбіты і загінуў. Загінуў геройскі.

Ляснік, які назіраў за боем, падабраў мёртвага лётчыка і пахаваў яго. Пасля вызвалення Кобрына ён

перадаў дакументы А. І. Марозава камандаванню палка і паказаў месца яго пахавання. Лётчык з ушанаваннямі быў перапахаваны ў г. Кобрыне на цэнтральнай плошчы Свабоды. У 1958 годзе рашэннем Кобрынскага райвыканкама брацкая магіла з яго рэшткамі была перанесена на вуліцу Першамайскую, у сквер імя генерала Пуганава, які таксама загінуў у баях за горад Кобрын у першыя дні вайны і пахаваны там жа. Такім чынам, рэшткі лётчыка-героя А. І. Марозава знайшлі вечны супакой у брацкай магіле ў скверы імя Пуганава.

25 лютага 1945 года А. І. Марозаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Усяго 22 гады было лётчыку Арсенію Марозаву, які атрымаў гэта вышэйшае і самае ганаровае званне за подзвіг, здзейснены ў нашым краі. Лётчык узнагароджаны ордэнам Леніна і двума ордэнамі Чырвонага Сцяга.



Сёння прыгожы сквер у цэнтры горада, дзе першапачаткова быў пахаваны герой, вуліца ў горадзе ў раёне былога аэрадрома носяць імя Марозава.

# Вуліца НАСТАСІЧА




По рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 92 ад 22 лютага 2000 года адна з вуліц у ваенным гарадку Кобрына названа імем Мілана Георгіевіча Настасіча. Гарвыканкам сваім рашэннем увекавечыў памяць аб былым камандзіру Кобрынскага верталётнага палка палкоўніку М. Г. Настасічу. Гэта рашэнне стала вынікам звароту групы былых кіраўнікоў горада, ветэранаў палка з просьбай аб увекавечанні памяці ваеннага лётчыка. Да 2008 года – вуліца імя Настасіча, з 2008 года – вуліца Настасіча (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).

На працягу чатырох дзесяцігоддзяў жыццё Кобрына было непарыўна звязана з лёсам размешчанага тут верталётнага палка. У мінулым гэта быў асобны верталётны

полк ВПС СССР і найстарэйшы верталётны полк у Беларусі.

Першым яго камандзірам (унікальны выпадак у гісторыі савецкай авіяцыі) стаў сербскі лётчык падпалкоўнік Мілан Настасіч, які ўзначальваў полк з 1962 года па 1970 год. Менавіта Мілан Георгіевіч Настасіч стаяў ля вытокаў фарміравання 65-й транспартна-баявой верталётнай базы.



**Настасіч Мілан Георгіевіч (29.12.1923 – 21.02.1999) – удзельнік Другой сусветнай вайны, ваенны лётчык, першы камандзір 65-га Кобрынскага верталётнага палка, палкоўнік.**

Нарадзіўся 29 снежня 1923 года ў г. Біеліна (Югаславія) у сям'і чыгуначніка. «Будзь працавітым і адказным, любі Радзіму і людзей», - такое завяшчанне ён атрымаў ад бацькоў.

З 1939 года юнак вучыўся ў політэхнічнай школе ў г. Нові-Сад, займаўся планерным спортам. Мілан Настасіч быў адным з мацнейшых планерыстаў Еўропы.

Калі родную Югаславію ахапіла полымя вайны, Мілан быў студэнтам. З'яўляючыся членам Саюза камуністычнай моладзі Югаславіі, з красавіка 1941 года ён удзельнічаў у антыгітлераўскім падполлі, потым уступіў у партызанскі атрад, прымаў удзел у шматлікіх баях. Яго

асабістая адвага выклікала вялікую павагу сярод баявых сяброў.

3 мая 1943 года Мілан Настасіч - камісар роты Народна-вызваленчай арміі Югаславіі (НВАЮ). Ён мужна змагаўся з акупантамі, за што ўзнагароджаны югаслаўскімі ордэнамі «За храбрасць», «За заслугі перад народам».

У канцы лістапада 1943 года па рашэнні штаба Народна-вызваленчай Арміі Мілана Настасіча перапраўляюць у Італію. У студзені 1944 года ён стаў камісарам штурманскай школы НВАЮ на вызваленай саюзнымі войскамі тэрыторыі Італіі, затым Егіпта.

У верасні 1944 года Вярхоўны штаб НВАЮ накіраваў Мілана Настасіча ў СССР. М. Г. Настасіч імкнуўся быць не проста баявым лётчыкам, а ўмелым, моцным пілотам, таму стаў курсантам Энгельскай ваеннай авіяцыйнай школы пілотаў імя М. М. Расковай, дзе вучыўся з лістапада 1944 года па снежань 1946 года.

Пасля паспяховага заканчэння ўстановы вяртаецца ў Югаславію і служыць у ваеннай авіяцыі. У 1948 годзе, калі Югаславія разарвала сувязі з СССР і іншымі краінамі сацлагера, Мілану прыйшлося зрабіць цяжкі выбар паміж жыццёвымі перакананнямі і ваеннай кар'ерай. У знак нязгоды з палітыкай генеральнага сакратара ЦК кампартыі Югаславіі І. Броз-Ціта 15 верасня 1948 года Мілан Настасіч на ваенным самалёце бамбардзіроўшчыку Пе-2 пераляцеў на тэрыторыю СССР. Яго гераічная біяграфія была больш пераканаўчай за любыя праверкі органаў, і М. Г. Настасіч быў залічаны на службу ва Узброеныя сілы СССР. У Югаславіі Мілан Георгіевіч быў завочна прыгавораны да смяротнага пакарання як здраднік, пазней пакаранне было

зменена на 20 гадоў зняволення, а ў 1965 годзе адменена асабіста І. Броз Ціта.

Пасля заканчэння ў 1959 годзе Ваенна-паветранай акадэміі Мілан Настасіч камандаваў палком стратэгічных бамбардзіроўшчыкаў Ту-16.

У 1960 годзе перайшоў на службу ў верталётную авіяцыю, у жніўні 1962 года прызначаны камандзірам сфарміраванага ім 65-га асобнага верталётнага палка, які з 1964 года базіраваўся ў Кобрыне. Стварэнне гэтага палка стала адным з галоўных здзяйсненняў у яго воінскім лёсе. Мілан Георгіевіч быў выключна чулым камандзірам, умелым выхавацелем салдат. Ён сам асабіста займаўся і лятаў з кожным пачынаючым лётчыкам. Яго запаведзь «Салдата не трэба шкадаваць, салдата трэба берагчы» жыла ў палку да апошніх дзён яго існавання.

У 1963 годзе палку ўручаны Баявы Чырвоны сцяг. У 1960-я гады полк удзельнічаў у розных вучэннях і выпрабаваннях верталётаў Мі-4 і Мі-6. У канцы сакавіка 1969 года 12 верталётаў Мі-4 65-га палка былі ў тэрміновым парадку прыцягнуты да выратавальных работ пасля моцнага землетрасення ў горадзе Кзыл-Орда (Кызылорд, Казахстан).

М. Г. Настасіч займаў пасаду камандзіра 65-га асобнага верталётнага палка да 1970 года, калі быў звольнены з ваенна-паветраных сіл у званні палкоўніка.

З 1970 года ў адстаўцы, жыў у Мінску. Ужо знаходзячыся ў СССР, ажаніўся, у 1952 годзе ў яго нарадзіўся сын Георгій, у 1956 годзе - дачка Алена.

За самаадданую службу ва Узброеных Сілах СССР, поспехі ў падрыхтоўцы лётных кадраў, высокую баявую

гатоўнасць палка М. Г. Настасіч быў узнагароджаны ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Мілан Георгіевіч Настасіч памёр 21 лютага 1999 года, пахаваны на Усходніх могілках г. Мінска. Валявы, адважны, мужны, сумленны чалавек - такімі характарыстыкамі надзялялі Мілана Настасіча людзі, якія ведалі яго асабіста. Ён навечна застанецца ў памяці кобрынчан рыцарам неба, вопытным асам, верным таварышам і сапраўдным камандзірам.

Пра гады існавання 65-га Кобрынскага верталётнага палка сёння нагадваюць сквер, помнік і верталёт на пастаменце ў былым ваенным гарадку на ўскраіне райцэнтра.






# Вуліца ПУГАНАВА




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 177 ад 17 чэрвеня 1964 года завулак Прамы быў перайменаваны ў вуліцу імя Пуганава (з 2008 г. – вуліца Пуганава). Вуліца размешчана ў паўночна-заходняй часцы горада. Адкрываецца мемарыяльнай дошкай, на якой чытаем: «*Вуліца імя Пуганава Віктара Паўлавіча. Камандзір 22 танкавай дывізіі генерал-маёр Пуганаў загінуў у танку пры абароне Радзімы ў наваколлі горада Кобрына ў вёсцы Імяніны 23 чэрвеня 1941 года*».



**Пуганаў Віктар Паўлавіч (10.02.1901 – 23.06.1941) – удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайн, военачальнік, генерал-маёр. Адзін з тых камандзіраў Чырвонай Арміі, хто прайшоў усе ступені ваеннай кар'еры – ад радавога чырвонаармейца да генерала.**

Нарадзіўся Віктар Пуганаў 10 лютага 1901 года ў г. Астрахані ў рабочай сям'і. Працаваў пасыльным на чыгунцы, качагарам маторнага судна параходнага таварыства «Кама» пад Астраханню.

У 1919 годзе добраахвотнікам пайшоў у Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію, ў 18 гадоў стаў чырвонаармейцам Астраханскага савецкага батальёна.

Пасля заканчэння школы чырвоных камандзіраў Віктар Пуганаў прызначаны камандзірам кулямётнага ўзвода. У гады грамадзянскай вайны праявілася яго прыродная кемлівасць, востры розум і выключная адвага. На Каўказскім фронце ён ваяваў ужо камандзірам кулямётнага ўзвода, пазней удзельнічаў у ліквідацыі белагвардзейскіх банд на Кубані, атрымаў раненне. Ваенны лёс кідаў Віктара Пуганава ў розныя куткі велізарнай краіны - ад Хабараўска да Ленінграда.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны вучыўся ў Маскве ў вышэйшай школе ваеннай маскіроўкі. У 1928 годзе закончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе, пасля чаго быў накіраваны ў Ленінград выкладчыкам браня-танкавых курсаў. Так Віктар Пуганаў канчаткова звязаў сваю будучыню з новым і перспектыўным родам войскаў - бранетанкавымі.

У 1930-е гады Віктар Паўлавіч займаў розныя камандныя пасады. У 1938 годзе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і прызначаны намеснікам начальніка Аўтабранятанкавага кіравання РККА.

4 чэрвеня 1940 года В. П. Пуганаву прысвоена званне генерал-маёра танкавых войскаў.

Са жніўня 1940 года па сакавік 1941 года Віктар Паўлавіч служыў начальнікам упраўлення баявой падрыхтоўкі аўтабранятанкавых войск Чырвонай Арміі. Пазней генерал Пуганаў атрымаў прызначэнне ўзначаліць 22-ю танкавую дывізію, якая дыслацыравалася на поўдні ад г. Брэста – у Паўднёвым ваенным гарадку. Дывізія пачала фарміравацца ў сакавіку-красавіку 1941 года на базе 29-й танкавай брыгады і ўваходзіла ў склад 14-га механізаванага корпуса 4-й арміі Беларускай асобай ваеннай акругі.

З раніцы 22 чэрвеня 1941 года 22-я танкавая дывізія вяла абарончыя баі на рубяжы Заходняга Буга на поўдзень ад Брэста. Камандзір дывізіі генерал-маёр В. П. Пуганаў і іншыя камандзіры і палітработнікі здолелі з мінімальнымі стратамі, без панікі арганізаваць выратаванне матэрыяльнай часткі і перагрупаванне войска для сустрэчы з ворагам.

23 чэрвеня ў час контрудару савецкіх войскаў з раёна Жабінкі дывізія разграміла мотакалону нямецкіх войскаў, змагалася супраць дзвюх танкавых, адной матарызаванай і некалькіх пяхотных дывізій ворага. Нягледзячы на падтрымку авіяцыі, колькасную перавагу ў танкавых падраздзяленнях, гітлераўцы ў першыя гадзіны вайны з вялікімі стратамі змаглі прайсці толькі на пяць-сем кіламетраў ад граніцы. Сумесна з 6-й і 42-й дывізіямі 22-я танкавая ўпарта супраціўлялася націску ворага. Савецкія воіны змагаліся самаахвярна. Танкісты з апошніх сіл утрымлівалі баявыя рубяжы, выконваючы загад камдыва. Але сілы былі няроўныя. Нясучы вялікія страты, 22-я танкавая дывізія адступала ад Жабінкі на Кобрын. Каля 10 гадзін раніцы нашы воіны змаглі затрымаць ворага на

рубяжы Тэўлі - Андронава – Патрыкі, і да 16 гадзін вораг тут не зрабіў і кроку наперад.

Каля 16 гадзін зноў успыхнуў бой. Гітлераўцы сцягнулі сюды шмат авіяцыі. Сустрэчны танкавы бой быў жорсткім. На чале контратакуючых быў генерал-маёр В. П. Пуганаў, ля вёскі Імянін ён асабіста павёў танкістаў у атаку. Калі скончыліся боепрыпасы, танкісты таранілі варожыя танкі. У гэтым баі геройскі загінуў у танку і генерал-маёр В. П. Пуганаў. Тут байцы і пахавалі свайго камандзіра. Пасмяротна генерал Пуганаў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені (6 мая 1965).

І сёння народная памяць з удзячнасцю захоўвае імёны мужных танкістаў, якія ахвяравалі сваім жыццём, трымаючы вогненную абарону пад Кобрынам. В. П. Пуганаў быў пахаваны ў в. Буховічы Кобрынскага раёна. У канцы 1950-х гадоў было зроблена перазахаванне ў



брацкай магіле ўсіх воінаў, якія загінулі ў баях за горад Кобрын. На скрыжаванні вуліц Першамайскай і Кірава створаны



мемарыял 174-м загінуўшым воінам і партызанам. Побач з брацкай магілай перазахавалі астанкі Віктара Пуганава, а сквер па вуліцы Першамайскай назвалі яго імем. У 2004 годзе ў памяць аб танкістах 22-й дывізіі ў Кобрыне ўстаноўлены на пастамент танк Т-44.

# Вуліца САНДАЛАВА




Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 118 ад 26 сакавіка 2010 года на карце Кобрына з’явілася вуліца Сандалава. Знаходзіцца ў новым квартале жылой забудовы ў раёне былога аэрадрома ў г. Кобрыне.



**Сандалаў Леанід Міхайлавіч (10.04.1900 – 23.10.1987) – удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-палкоўнік (1944), Ганаровы грамадзянін горада Кобрына (1966).**

Нарадзіўся 28 сакавіка (10 красавіка) 1900 года ў г. Вічуга Іванаўскай вобласці (Расія). У восем гадоў бацькі аддалі яго ў Тэзінскае пяцікласнае фабрычнае вучылішча, якое Леанід скончыў з

пахвальнай граматай.

Да 1919 года працаваў на фабрыцы. Быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў мясцовай камсамольскай арганізацыі. Увесну 1919 года добраахвотна паступіў на Іванава-Узнясенскія курсы камсаставу, затым ваяваў на франтах грамадзянскай вайны. У Чырвонай арміі з 1919 года. Член КПСС з 1925 года.

У 1926 годзе Леанід Сандалаў закончыў Кіеўскую аб'яднаную ваенную школу камандзіраў, у 1934 годзе - Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе, у 1937 годзе - Ваенную акадэмію Генштаба.

Ён удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. З 1940 года Л. М. Сандалаў - начальнік штаба, у ліпені-жніўні 1941 года - камандуючы 4-й арміяй, начальнік штаба Цэнтральнага фронту.

Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Жабінкі, Кобрына і інш.

У 1941-1945 гадах - начальнік штаба Бранскага, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Генерал-палкоўнік (1944).

Да 1953 года Л. М. Сандалаў - на камандных пасадах у Савецкай арміі. У 1953-1955 гадах знаходзіўся ў распараджэнні Міністра абароны СССР.

З верасня 1955 года ў запасе.

Леанід Міхайлавіч Сандалаў - аўтар шэрагу мемуараў пра Вялікую Айчынную вайну: «Пагарэла-Гарадзішчанская аперацыя» (1960), «Цяжкія рубяжы» (1965), «Перажытае» (1966), «На маскоўскім напрамку» (1970), «Пасля пералому» (1983).

Леанід Міхайлавіч узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава і Кутузава I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, а таксама замежнымі ордэнамі.

У 1966 годзе Л. М. Сандалаў стаў Ганаровым грамадзянінам горада Кобрына (рашэнне выканаўчага камітэта Кобрынскага гарадскога Савета дэпутатаў № 261 ад 30 жніўня 1966).

Памёр Леанід Міхайлавіч 23 кастрычніка 1987 года.

Леанід Міхайлавіч Сандалаў па праве належыць да выдатнай плеяды палкаводцаў і военачальнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Кіруючы армейскімі, а затым і франтавымі штабамі, ён прайшоў нялёгкімі дарогамі вайны з першага да апошняга яе дня.

# Вуліца СУРЫНА




17 чэрвеня 1964 года па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 177 у г. Кобрыне з’явілася вуліца імя Сурына Б. М. З 2008 года – вуліца Сурына (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008) На доме № 7 прыватнага сектара ўсталявана мемарыяльная дошка, якая апавядае пра подзвіг героя.



**Сурын Барыс Мікалаевіч (02.08.1907 – 22.06.1941) – удзельнік баёў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, першы камандзір 123-га знішчальнага авіяпалка.**

Нарадзіўся ў Ленінградзе 2 жніўня 1907 года ў сям’і служачых.

З 1923 года Барыс Сурын працаваў рабочым на цагельным заводзе, а ў 1926 быў накіраваны на вучобу ў артылерыйскую школу.

У 1928 годзе пачаў служыць у Чырвонай Арміі, затым вучыўся ў ваеннай школе лётчыкаў.

У 1938 годзе Б. М. Сурына назначылі камандзірам эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, а ў 1940-м - камандзірам 123-га знішчальнага авіяпалка. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны гэты полк нёс пастаяннае дзяжурства на асноўным аэрадроме і паблізу граніцы для перахвату нямецкіх самалётаў, якія парушалі паветраную прастору нашай краіны.

22 чэрвеня 1941 года, каля дзвюх гадзін ночы, камандзір палка Б. М. Сурын падняў увесь састаў па баявой трывозе. Нягледзячы на ўстойлівае меркаванне, што ў першыя дні вайны ў пагранічнай зоне ўсе аэрадромы разам з авіяцыяй былі разбіты і знішчаны, да Кобрына гэта нельга аднесці. І ўсё дзякуючы мужнасці і ваеннаму майстэрству Барыса Сурына. Па яго загаду самалёты знялі з «чырвонай лінейкі», расцягнулі па аэрадрому і замаскіравалі ў кустах, якія акружалі лётнае поле. Гэта і выратавала тэхніку ад поўнага знішчэння ў першыя хвіліны вайны. 123-ці полк знаходзіўся ў поўнай баявой гатоўнасці, усе 30 самалётаў былі надзейна замаскіраваны.

Як толькі закончыўся налёт ворага, маёр Сурын аддаў загад усім узняцца ў паветра. У першы дзень вайны лётчыкі палка на працягу 10 гадзін вялі бесперапынны паветраны бой і збілі 30 варожых самалётаў, страціўшы пры гэтым дзевяць сваіх.

Сам камандзір палка здзейсніў пяць вылетаў, чатыры з іх — баявыя, збіў тры нямецкія самалёты. У чацвёртым баі быў смяротна паранены, але здолеў пасадзіць самалёт на паласу аэрадрома. Калі тэхнікі палка падбеглі да самалёта, высветлілася, што лётчык ужо мёртвы.

Пахаваны Барыс Мікалаевіч Сурын непадалёку ад Кобрына. Першы камандзір 123-га авіяпалка назаўсёды застаўся на кобрынскай зямлі.




У в. Імянін Кобрынскага раёна на зданні сярэдняй школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

# НА КАРЦЕ ГОРАДА ГЕРОЯЎ ІМЁНЫ














# Вуліца ГАСТЭЛА




Імя ў гонар М. Ф. Гастэла вуліца атрымала 15 лістапада 1948 года па рашэнні № 193 Кобрынскага гарвыканкама. Праходзіць паралельна вуліцы Дзекаб-рыстаў ад вуліцы Суворава да вуліцы Дзяржынскага.



**Гастэла Мікалай Францавіч (06.05.1907 – 26.06.1941) – лётчык, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гадоў, абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1941), кавалер ордэна Леніна.**

Нарадзіўся 6 мая 1907 года ў Маскве. Бацька — Франц Паўлавіч Гастыла, беларус родам з вёскі Плужыны (цяпер Карэліцкі

раён Гродзенскай вобласці), у 1900 годзе прыехаў на заробкі ў Маскву (дзе яго прозвішча пачалі вымаўляць на маскоўскі манер — «Гастэла»), працаваў у ліцейных майстэрнях на Казанскай чыгунцы. Маці — Настасся Сямёнаўна Кутузава, руская, была белашвачкай.

У 1914—1918 гадах Мікалай Гастэла вучыўся ў 3-м Сакольніцкім гарадскім мужчынскім вучылішчы імя А. С. Пушкіна. Працоўную дзейнасць пачаў у 1923 годзе, стаўшы вучнем сталяра.

У 1924 годзе сям'я Гастэла пераязджае ў Мурам, дзе Мікалай паступае слесарам на паравозабудаўнічы завод імя Ф. Э. Дзяржынскага, на якім працаваў і яго бацька. Паралельна з працоўнай дзейнасцю, Мікалай Гастэла заканчае школу. У 1928 годзе ўступіў у ВКП (б).

Закончыў Луганскую ваенную школу лётчыкаў у 1933 годзе. З 1932 года – у Чырвонай Арміі. М. Гастэла – удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939 годзе, савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гадоў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны капітан Гастэла камандаваў эскадрылляй, удзельнічаў у бамбардзіроўцы танкавай і механізаванай калон праціўніка. 26 чэрвеня ў час бамбардзіроўкі варожай танкавай калоны на дарозе Маладзечна - Радашковічы з членамі экіпажа А. А. Бурдзенюком, А. А. Калініным, Р. М. Скарабагатавым Мікалай Гастэла накіраваў ахоплены полымем самалёт на скопішча варожых танкаў, аўтамашын і бензацыстэрнаў.

У 1941 годзе камандзіру авіяэскадрыллі капітану Мікалаю Францавічу Гастэла пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

# Вуліца маршала ЖУКАВА




Па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 127 ад 18 мая 1989 года вуліца Жданава (да 1930-х гадоў – Цвяточная, да 1948 года – Піянерская «А») была перайменавана ў вуліцу Жукава. З 18 верасня 2008 года – гэта вуліца маршала Жукава (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008). Знаходзіцца ў цэнтральнай частцы горада.



У 2024 годзе па ініцыятыве Кобрынскага райвыканкама і па замове дзяржаўнага прадпрыемства «Кобрынскае ЖКГ» створаны мурал, прысвечаны памяці маршала Савецкага Саюза Георгія Канстанцінавіча Жукава (мастак-афарміцель Арцём Саракалетаў). Мурал размешчаны на кантавой сцяне дома № 8 па вуліцы Пушкіна, якая выходзіць на вуліцу, названую ў гонар вялікага палкаводца.



**Жукаў Георгій Канстанцінавіч (01.12.1896 — 18.06.1974) – савецкі ваенны і дзяржаўны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза (1943), чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956).**

Нарадзіўся Георгій Жукаў 1 снежня 1896 года ў в. Стралкоўка Калужскай вобласці ў сям'і селяніна.

Удзельнік Першай сусветнай вайны, малодшы унтэр-афіцэр, узнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. У Чырвонай Арміі з 1918 года. У гады грамадзянскай вайны камандаваў узводам і эскадронам.

У 1926–1931 гадах выкладаў у БДУ курс «Вышэйшая дапрызыўная ваенная падрыхтоўка студэнтаў». У 1930 годзе Г. К. Жукаў паспяхова закончыў курсы вышэйшага камсаставу. У 1938–1939 гадах служыў намеснікам камандуючага Беларускай Асобай ваеннай акругі. Выдатна вызначыўся ў баях з японцамі на р. Халхін-Гол. 28 верасня 1939 года прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У студзені – ліпені 1941 года – начальнік Генштаба, намеснік наркама абароны СССР. Са жніўня 1942 года Г. Жукаў – першы намеснік наркама і намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вызначыўся як таленавіты военачальнік, адыграў важнейшую ролю ў разгроме нямецка-фашысцкіх войскаў у Ленінградскай і Маскоўскай бітвах (1941–1942), у час прарыву блакады

Ленінграда, у Сталінградскай і Курскай бітвах (1942–1943), у час наступу на Праваўзбярэжнай Украіне і ў Беларускай аперацыі «Баграціён» (1943–1944), у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях (1944–1945). 8 мая 1945 года Г. К. Жукаў ад імя Вярхоўнага Галоўнакамандуючага прыняў капітуляцыю фашысцкай Германіі. За паспяховае кіраўніцтва аперацыямі франтоў 29 ліпеня 1944 года ўзнагароджаны другім, а 1 чэрвеня 1945 года – трэцім медалём «Залатая Зорка». 24 чэрвеня 1945 года прымаў Парад Перамогі ў Маскве.

У 1945–1946 гадах Г. К. Жукаў з'яўляўся галоўнакамандуючым Групай савецкіх войскаў і кіраўніком Савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі. З сакавіка 1946 года – галоўнакамандуючы Сухапутнымі войскамі і намеснік міністра Узброеных Сіл СССР. З чэрвеня 1946 года камандаваў войскамі Адэскай, з 1948 года – Уральскай ваенных акруг.

З 1953 года Г. К. Жукаў служыў першым намеснікам міністра, з 1955 года – міністрам абароны СССР.

1 снежня 1956 года Георгій Канстанцінавіч узнагароджаны чацвёртым медалём «Залатая Зорка». Двойчы ўзнагароджаны ордэнам «Перамога», а таксама многімі іншымі савецкімі і замежнымі ордэнамі і медалямі. Імем Жукава названа малая планета.

Памёр Георгій Канстанцінавіч Жукаў 18 чэрвеня 1974 года. Пахаваны на Краснай плошчы ля Крамлёўскай сцяны. Бронзавы бюст устаноўлены на радзіме героя. Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах, у тым ліку ў Кобрыне.

# Вуліца ЗАСЛОНАВА




Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1958 года вуліца Чыгуначная (да 1921 года – Маставая) перайменавана ў вуліцу імя Канстанціна Заслонава. З 2008 года – вуліца Заслонава (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008). Вуліца знаходзіцца на зарэчнай частцы горада.



**Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч (07.01.1910 – 13.11.1942) – адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падпольнага і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1943), кавалер ордэнаў Леніна (1942, 1943).**

Нарадзіўся 25 снежня 1909 года (7 студзеня 1910 – па новым стылі) у г. Асташкаве Цвярской губерні ў рабочай сям'і. Вучыўся ў адзінай працоўнай школе ў г. Невель у 1924–1927 гадах. Бацька трымаў невялікую гаспадарку. У 1930-я гады ўся сям'я (бацька, дзве сястры і два браты Косці) была раскулачана і выслана на Кольскі паўвостраў, у Хібінагорск (цяпер Кіраўск). Грошай не хапала, і васьмігадовы Косця працаваў пастухом, а праз год пайшоў у школу.

У 1927 годзе школьная камсамольская арганізацыя накіравала Канстанціна як выдатніка ў Вялікалукскую прафтэхшколу чыгуначнага транспарту, якую ён закончыў у 1930 годзе. Па камсамольскім прызыве разам з жонкай К. Заслонаў быў накіраваны на Далёкі Усход, дзе аднаўляў дэпо на станцыі Вяземская пад Хабараўскам. У 1935 годзе ён стаў памочнікам начальніка паравознага дэпо Новасібірска.

З 1937 года К. С. Заслонаў быў начальнікам дэпо станцыі Рослаў, а з кастрычніка 1939 года – станцыі Орша.

У пачатку вайны пры набліжэнні нямецкіх войскаў да Оршы эвакуіраваўся ў Маскву і працаваў у дэпо імя Ільіча. У верасні 1941 года ў Маскве сфарміраваў з чыгуначнікаў партызанскі атрад, у кастрычніку перайшоў з ім лінію фронту, уладкаваўся на працу ў Аршанскае дэпо.

Стварыў падпольную групу, удзельнікі якой шляхам выкарыстання «вугальных мін» (міны, замаскіраваныя пад каменны вугаль) за тры месяцы падарвалі 93 нямецкія паравозы. Узначаліў некалькі дыверсійных груп, якія разам з падпольнымі групамі Аршанскага патрыятычнага падполля паралізавалі работу чыгуначнага вузла. Падпольная

арганізацыя чыгуначнага дэпо, якую узначальваў Канстанцін Заслонаў, наносілі ворагу вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

З прычыны пагрозы арышту ў сакавіку 1942 года Канстанцін Заслонаў з групай пакінуў Оршу і арганізаваў партызанскі атрад, які правёў шэраг паспяховых баявых рэйдаў у раёне Віцебск – Орша – Смаленск, знішчыўшы вялікую колькасць варожых салдат і тэхнікі. Арганізоўваў дыверсіі на чыгунцы, узначальваў баявыя дзеянні супраць ворага на тэрыторыі Аршанскага, Багушэўскага, Лёзненскага, Сененскага і іншых раёнаў Віцебшчыны. Партызанскі псеўданім – «Дзядзька Косця».

Неўміручай славай пакрыў сваё імя ў жорсткіх бітвах з фашызмам на беларускай зямлі Канстанцін Заслонаў. 13 лістапада 1942 года ён загінуў у баі з карным атрадам ля в. Купаваць Сенненскага раёна.

7 сакавіка 1943 года за заслугі перад Радзімай і гераізм Канстанціну Сяргеевічу Заслонаву было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна і медалямі.

У 1947 годзе астанкі героя перапахаваны на Прывакзальнай плошчы ў г. Оршы, пастаўлены помнік. У Оршы створаны мемарыяльны музей. Яго імя носіць лакаматыўнае дэпо ў Оршы, дзіцячая чыгунка ў Мінску, цеплавоз і мноства вуліц у гарадах і пасёлках Беларусі, у тым ліку і ў Кобрыне.



# Вуліца
# ЗОІ КАСМАДЗЯМ'ЯНСКАЙ




Гэту назву вуліца атрымала неўзабаве пасля вайны па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 193 ад 15 лістапада 1948 года. Вуліца знаходзіцца паміж вуліц Гастэла і Панфілаўцаў у цэнтры горада.



**Касмадзям'янская Зоя Анатольеўна (13.09.1923 – 29.11.1941) – партызанка, Герой Савецкага Саюза (1942).**

Нарадзілася 13 верасня 1923 года ў сяле Асіна-Гай Гаўрылаўскага раёна Тамбоўскай вобласці. Бацькі Зоі – Анатолій Пятровіч і Любоў Цімафееўна – былі сябрамі дзяцінства. Ажаніўшыся, пэўны час жылі ў роднай вёсцы, а калі крыху падраслі дзеці, Зоя і

Шура, паехалі ў Сібір. Год працавалі настаўнікамі ў Енісейскай акрузе, а потым пераехалі ў Маскву.

Усе ў сям'і вельмі любілі чытаць. Адным з любімых пісьменнікаў быў для іх Аркадзь Гайдар. Аднойчы Зоі ўдалося ўбачыць пісьменніка. Яны пасябравалі, і Гайдар падарыў дзяўчынцы сваю кнігу з аўтографам. Прыкладам для Касмадзям'янскіх былі чэлюскінцы, удзельнікі грамадзянскай вайны, герой рамана Э. Л. Войніч «Овод». Аднойчы Зоя прачытала апавяданне пра падпольшчыцу Таццяну Саламаху, пра яе стойкасць і мужнасць. Вобраз бясстрашнай Тані дапамог самой Зоі вынесці непамерныя мукі і здзекі фашыстаў, калі ад яе патрабавалі выдаць таварышаў. Яна і назвала сябе Таняй.

У кастрычніку 1941 года ў самы цяжкі для краіны час, калі вораг стаяў каля Масквы, вучаніца 10-га класа 201-й маскоўскай школы запісалася добраахвотнікам і апынулася ў трэніровачным лагеры разведдыверсійнай вайсковай часткі 9903. Усіх добраахвотнікаў папярэдзілі, што ім трэба будзе выконваць заданні ў аператыўным тыле фашыстаў, што большасць з іх, хутчэй за ўсё, загіне.

Хуткаплынныя трохдзённыя курсы (азнаямленне з асновамі мінавання) і ў бой - вораг рваўся да Масквы і часу на падрыхтоўку кваліфікаваных дыверсантаў проста не было. Асноўнай задачай байцоў 9903-й часткі было стварэнне максімальна некамфортных умоў для непрыяцеля ў яго аператыўным тыле на Маскоўскім кірунку. Неабходна было спальваць дамы, у якіх кватараваліся салдаты з падраздзяленняў аператыўнага рэзерву, знішчаць баявую тэхніку, вузлы і лініі сувязі, масты праз рэкі, ладзіць дыверсіі на чыгунцы і г. д.

У лістападзе 1941 года Зоя ў складзе развед-дыверсійнай групы адправілася на выкананне свайго першага баявога задання. Аднак амаль адразу пасля перасячэння лініі фронту група нарвалася на ўзмоцнены ваенны патруль гітлераўцаў. Зоя вырашыла ў адзіночку распачаць спробу выканаць пастаўленую баявую задачу, але была схоплена гітлераўцамі ў в. Пятрышчава Маскоўскай вобласці і пасля жорсткіх катаванняў павешана. Ні катаванні, ні здекі не змаглі прымусіць Зою выдаць сваіх таварышаў і мэту задання. На пытанне гаспадыні дома, як яе завуць, назвалася Таняй з Масквы. На эшафот бяссмерця Зоя ўзышла ў вёсцы Пятрышчава 29 лістапада 1941 года.

Публічным пакараннем змучанай дзяўчыны фашысты думалі запалохаць мясцовае насельніцтва, а атрымалася наадварот. Перадсмяротныя словы Зоі: «Нас 200 мільёнаў, усіх не перавешаеце», – сталі каталізатарам нянавісці да звярынага твару фашызма. Усе, хто мог, адпраўляліся на фронт і ў партызаны, каб адпомсціць за Зою. Стойкасць Зоі, яе бясстрашша натхнілі сотні і сотні людзей на бязлітасную барацьбу з ворагам. Яна стала сімвалам мужнасці, стойкасці і непераможнасці ўсяго народа, прыкладам вернасці Айчыне. 16 лютага 1942 года З. А. Касмадзям’янскай пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



*Вуліца Зоі Касмадзям’янскай*

# Вуліца АЛЕГА КАШАВОГА




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 239 ад 27 верасня 1955 года вуліца Роўная ў г. Кобрыне атрымала імя Кашавога. Да 2008 года – завулак А. Кашавога, потым вуліца Алега Кашавога (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).



**Кашавы Алег Васільевіч (08.06.1926 – 09.02.1943) – адзін з арганізатараў падпольнай камсамольскай арганізацыі «Маладая гвардыя», Герой Савецкага Саюза (1943).**

Нарадзіўся 8 чэрвеня 1926 года ў г. Прылукі Чарнігаўскай вобласці Украінскай ССР у сям'і служачага. Сям'я часта пераязджала з месца на месца ў сувязі з пераводамі бацькі Васіля Фядосьевіча ў розныя гарады Украіны.

Жылі ў Палтаве, Ржышчаве, Каневе. У 1940 годзе пераехалі ў г. Краснадон.

Да самазабыцця юнак захапляўся кнігамі. Самымі любімымі пісьменнікамі Алега Кашавога былі М. Астроўскі, М. Горкі, Э. Войніч, Т. Шаўчэнка. Настольнай кнігай Алега з’яўлялася «Как закалялась сталь» М. Астроўскага. З усіх гэтых твораў малады хлопец чэрпаў прыклады любові да Радзімы, мужнасці і самаахвярнасці, што пасля леглі ў аснову подзвігу і сфармавалі яго гераічную біяграфію.

У чэрвені 1941 года Алег закончыў восем класаў. У школе № 1 імя А. М. Горкага, дзе вучыўся юнак, ён пазнаёміўся з будучымі маладагвардзейцамі.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Алегу было ўсяго 16 год. Ён адразу ўключыўся ў пасільную дапамогу фронту — даглядаў за параненымі ў шпіталі і выпускаў для ўзняцця іх настрою сатырычную газету «Кракадзіл». Калі Краснадон быў захоплены немцамі, Алег Кашавы цяжка перажываў бясчынствы, якія фашысты здзяйснялі ў горадзе, што і заахвоціла яго ў верасні 1942 года ўзначаліць падпольную камсамольскую арганізацыю супраць захопнікаў. У сваю чаргу, партыйнае падполле курыравала моладзь, якая туды ўваходзіла. Створаная арганізацыя, якая праславілася затым на ўсю краіну сваімі подзвігамі, атрымала назву «Маладая гвардыя». У яе ўвайшлі амаль усе камсамольцы розных узростаў.

Алег Кашавы быў вельмі каштоўным кадрам падполля. Яго маці добра разумела па-нямецку, ды яшчэ ў іх доме пасяліліся высокапастаўленыя нямецкія афіцэры. Актыўны юнак разведваў і пастаўляў каштоўную інфармацыю ў штаб. Ён распаўсюджваў лістоўкі, граміў

фашысцкія аўтамабілі, падпальваў харчовыя запасы ворага. Маладагвардзейцы збіралі зброю, а каб падтрымаць сем'і франтавікоў матэрыяльна, інкогніта дапамагалі прадуктамі. Псавалі тэлеграфную і тэлефонную сувязі, зрывалі ўгон жывёлы ў Германію. Калі даведаліся, што падрыхтаваны дакументы на адпраўку тысяч жыхароў у нямецкую няволю, спалілі ўправу, дзе захоўваліся спісы.

Фашысты ніяк не маглі выйсці на след падполля. У студзені 1943 года, калі арганізацыя была раскрыта немцамі, Алег Кашавы спрабаваў перайсці лінію фронту, але 26 студзеня 1943 года быў схоплены фашыстамі на ст. Картушына і пасля катаванняў расстраляны каля г. Равянькі. Можна толькі ўявіць, што перажыў ён у засценках жандармерыі, калі ў няпоўных 17 гадоў стаў увесь сівы.

Пасля вызвалення горада Чырвонай Арміяй Алег Кашавы быў пахаваны ў брацкай магіле на цэнтральнай плошчы ў Равеньках. 13 верасня 1943 года Алегу Васільевічу Кашавому пасмяротна прысвоена імя Героя Савецкага Саюза.

Яго подзвіг і біяграфія сталі шырока вядомыя ва ўсім Савецкім Саюзе як сімвал бясстрашша перад тварам ворага і адданасці ідэалам. На аснове дзейнасці Алега Кашавога была напісана кніга і зняты мастацкі фільм «Маладая гвардыя». Імем героя былі названы шахты, школы, піянерскія дружыны, вуліцы. У Беларусі шмат вуліц імя Алега Кашавога ў гарадах і пасёлках, у тым ліку ў Кобрыне.

# Завулак КІЖАВАТАВА




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 196 ад 27 жніўня 1969 года завулку ў Кобрыне прысвоена імя Героя-пагранічніка Кіжаватага. З 2008 года – завулак Кіжаватага (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).



**Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч (31.08.1907 – 23.06.1941) – савецкі камандзір-пагранічнік, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1965), Ганаровы грамадзянін горада Брэста (1985).**

Нарадзіўся 31 жніўня 1907 года ў сяле Селікса Гарадзішчанскага павета Пензенскай губерні (цяпер сяло Гарадзішчанскага павета Пензенскай губерні) у сялянскай сям'і.

У Чырвонай арміі А. Кіжаватаў з 15 лістапада 1929 года. Закончыў школу малодшага каманднага саставу ў артылерыйскім дывізіёне, у 1930 годзе стаў камандзірам гарматы ў асобным конным дывізіёне Заходняй пагранічнай акругі.

А. М. Кіжаватаў праходзіў службу на Куковіцкай заставе Цімковіцкага пагранатрада ў Беларусі. У маі 1938 года — памочнік начальніка пагранзаставы. У 1939 годзе прысвоена званне малодшы лейтэнант, прыняты ў ВКП(б). Удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Заходняй Беларусі (1939).

У верасні 1939 года Андрэй Мітрафанавіч назначаны выконваючым абавязкі начальніка пагранзаставы ў г. Брэсце. 17 ліпеня 1940 года малодшы лейтэнант Кіжаватаў назначаны начальнікам 9-й пагранзаставы 17-га Брэсцкага Чырвонасцяжнага пагранатрада. Застава была размешчана ля Цярэспальскіх варотаў у Цытадэлі Брэсцкай крэпасці. 25 лютага 1941 года яму было прысвоена званне лейтэнанта.

З першых хвілін Вялікай Айчыннай вайны лейтэнант А. М. Кіжаватаў арганізаваў упартае супраціўленне ворагу на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Пад яго камандаваннем воіны пагранзаставы першымі прынялі бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Адбілі шэсць варожых атак, двойчы самі пераходзілі ў контратаку.

Андрэй Кіжаватаў быў двойчы цяжка паранены. 29 чэрвеня ён і 17 параненых воінаў засталіся прыкрываць групу прарыву пад кіраўніцтвам А. Я. Патапава. Прарыў закончыўся няўдачай — большасць яго ўдзельнікаў загінулі альбо трапілі ў палон. Загінуў і Андрэй Кіжаватаў.

Трагічна склаўся лёс сям'і А. М. Кіжаватава. Яго маці Настасся Іванаўна, жонка Кацярына Іванаўна, дзеці Нюра (15 год), Валя (11 год) і Галя (2 гады) былі расстраляны гітлераўцамі восенню 1942 года ў в. Велікарыта Малартыцкага раёна.

Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР 6 мая 1965 года А. М. Кіжаватаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Пензе, Камянцы, Кобрыне. У гонар героя перайменавана роднае сяло. У Пензе 7 мая 2015 года на вуліцы яго імя адкрыта мемарыяльная дошка (дом № 13).

Адна з застаў Чырвонасцяжнага пагранічнага атрада імя Ф. Э. Дзяржынскага ў 1958 годзе названа яго імем, на яе тэрыторыі ўстаноўлены помнік.



У Брэсце на вуліцы імя Кіжаватава (названа ў 1967 годзе) устаноўлена мемарыяльная дошка (дом № 64), на алеі «Іх імёнамі названы вуліцы ў Брэсце» ўстаноўлены барэльеф. У скверы пагранічнікаў у межах мемарыялу «Стражам границ» А. М. Кіжаватаву ўстаноўлена стэла.

У 1985 годзе Андрэю Мітрафанавічу Кіжаватаву прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Брэста».

# Вуліца МАТРОСАВА




Па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 177 ад 20 кастрычніка 1948 года вуліца Школьная (да 1921 года – Прачысценская) перайменавана ў вуліцу Аляксандра Матросава. З 2008 года – вуліца Матросава (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).





**Матросаў Аляксандр Мацвеевіч** (05.02.1924 – 23.02.1943) **– удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, чырвонаармеец, Герой Савецкага Саюза (1943, пасмяротна).**

Нарадзіўся 5 лютага 1924 года ў Днепрапятроўску. Рана страціў бацькоў і выхоўваўся ў Іванаўскім дзіцячым доме Ульянаўскай вобласці, дзе закончыў сем класаў, і ў працоўнай дзіцячай калоніі ў г. Уфе.

Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны А. Матросаў неаднаразова звяртаўся з пісьмовымі просьбамі накіраваць яго на фронт. У верасні 1942 года быў прызваны Кіраўскім РВК г. Уфы ў Чырвоную Армію і пачаў вучобу ў Краснахолмскім пяхотным вучылішчы. У лістападзе 1942 года ўступіў у ВКЛСМ.

8 студзеня 1943 года разам з курсантамі вучылішча добраахвотнікам у складзе маршавай роты адправіўся на Калінінскі фронт. Служыў у складзе 2-га асобнага стралковага батальёна 91-й асобнай Сібірскай добраахвотнай брыгады імя І. В. Сталіна (пазней 254-ы гвардзейскі стралковы полк 56-й гвардзейскай стралковай дывізіі (Калінінскі фронт).

23 лютага 1943 года ў баі за в. Чарнушкі (Пскоўская вобласць, Расія) гвардыі радавы Аляксандр Матросаў сваім целам закрыў амбразуру нямецкага дзота, гэтым забяспечыў поспех атакі падраздзялення. Моцны

кулямётны агонь з варожага дзота не даваў магчымасці выканаць пастаўленую задачу. Тады Аляксандр Матросаў, манеўруючы, незаўважна падкраўся да варожай кропкі і кінуў туды дзве гранаты. На некаторы час дзот замоўк, але калі салдаты рушылі наперад, зноў пачаў касіць байцоў. І тады Аляксандр закрыў амбразуру сваім целам… Загінуў у 19 гадоў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 19 чэрвеня 1943 года чырвонаармейцу Аляксандру Матросаву было пасмяротна прысвоена званне «Герой Савецкага Саюза».

Пахавалі Аляксандра Матросава на месцы геройскай гібелі, а ў 1948 годзе перапахавалі ў г. Вялікія Лукі Вялікалуцкай вобласці (з 1957 года Пскоўскай вобласці), дзе стварылі мемарыяльны комплекс і музей, паставілі помнік. Імя Матросава носіць полк, у якім ён служыў, пераклічка воінаў палка пачынаецца з Матросава.

Усяго да таго моманту, калі ўсёй краіне стаў вядомы подзвіг Матросава, 45 чалавек здзейснілі такія ж геройскія ўчынкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны подзвіг А. Матросава паўтарылі больш за 400 чалавек, у т. л. беларус П. І. Купрыянаў. Подзвіг Аляксандра Матросава аказаў вялікі ўплыў падчас вайны не толькі на салдат Чырвонай Арміі, але і на ўсё насельніцтва нашай краіны. Яго імя стала сінонімам асабістай мужнасці і адвагі.

Шырока асвятляўся геройскі ўчынак у газетах, часопісах, літаратуры, кіно. Імем Аляксандра Матросава названы шэраг вуліц і паркаў у многіх гарадах Расіі і краінах СНД, у Рэспубліцы Беларусь. Ёсць вуліца імя Матросава і ў Кобрыне.

# Вуліца ПЯТРА МАШЭРАВА







У 2024 годзе, напярэдадні Дня вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, на карце Кобрына з'явілася вуліца ў гонар годнага сына беларускага народа **Пятра Міронавіча Машэрава**. Вуліца Каліноўскага была перайменавана ў вуліцу Пятра Машэрава. Паколькі ў горадзе ўжо была вуліца Машэрава, прыйшлося змяніць і яе назву - зараз гэта вуліца Яловая. Вуліца Пятра Машэрава - адна з густанаселеных вуліц у горадзе, знаходзіцца ў паўднёвай частцы раёна.



**Машэраў Пётр Міронавіч (26.02.1918 – 04.10.1980) – партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў савецкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, першы сакратар ЦК КПБ.**

**У 1944 годзе за гераізм і адвагу, праяўленыя ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Пётр Міронавіч Машэраў стаў Героем Савецкага Саюза, у 1978 годзе за поспехі ў мірны час абвешчаны Героем Сацыялістычнай Працы.**

Нарадзіўся 13 лютага 1918 года ў в. Шыркі Сенненскага раёна на Віцебшчыне ў сялянскай сям'і.

Закончыў Віцебскі педагагічны інстытут (1939). У 1939–1941 гадах – выкладчык фізікі і матэматыкі ў Расонскай сярэдняй школе Віцебскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну ў жніўні 1941 года Пётр Машэраў стварыў і ўзначаліў Расонскае патрыятычнае падполле. З красавіка 1942 года - камандзір партызанскага атрада імя Шчорса, які дзейнічаў у Расонскім, Дрысенскім, Асвейскім раёнах БССР, у суседніх раёнах РСФСР і Латвійскай ССР. З сакавіка 1943 года – камісар партызанскай брыгады імя К. К. Ракасоўскага Віцебскай вобласці. Пад яго началам народныя мсціўцы наносілі ўдары па тылах акупантаў. У баях адважны камандзір быў

двойчы паранены. З верасня 1943 года П. М. Машэраў – першы сакратар Вілейскага падпольнага абкама ЛКСМБ.

Менавіта за сваю актыўную дзейнасць Пётр Міронавіч атрымаў Залатую Зорку Героя і першы свой ордэн Леніна (1944). А ўсяго Пётр Машэраў сем разоў быў уганараваны найвышэйшай узнагародай СССР. Дарэчы, сярод беларусаў гэта самы вялікі паказчык.

З ліпеня 1944 года П. М. Машэраў – першы сакратар Маладзечанскага абкама ЛКСМБ, з ліпеня 1946 года – сакратар, з кастрычніка 1947 года – першы сакратар ЦК ЛКСМБ. З ліпеня 1954 года – другі сакратар Мінскага абкама КПБ.

Брэстчына стала часткай біяграфіі П. М. Машэрава ў 1955 годзе, калі ён быў першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ. Аднак і пазней, калі Пётр Міронавіч узначаліў рэспубліку ў якасці першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі, ён нярэдка бываў у Брэсцкім рэгіёне. Неаднойчы бываў на Кобрыншчыне, дзе яго дасюль памятаюць і паважаюць.

З красавіка 1959 года Пётр Міронавіч Машэраў – сакратар, са снежня 1962 года – другі сакратар, з сакавіка 1965 года – першы сакратар ЦК КПБ. Пад кіраўніцтвам П. М. Машэрава Беларусь стала адной з высокаразвітых рэспублік былога СССР, дасягнула значных поспехаў у стварэнні індустрыяльнага і сельскагаспадарчага патэнцыялу, будаўнічага комплексу, у развіцці адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947–1955), (1959–1980). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1950–1961), (1966–1980).

П. М. Машэраў узнагароджаны ордэнамі Леніна (сем разоў), ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені.

Пётр Міронавіч Машэраў загінуў у аўтакатастрофе 4 лістапада 1980 года. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

П. М. Машэраў быў выдатным дзяржаўным дзеячам і неверагодна папулярнай асобай, надзвычай яркай, творчай натурай. Ён дзіўным чынам спалучаў у сабе якасці палітыка і гаспадарчага дзеяча, партыйнага лідэра і сапраўднага інтэлігента. Яго жыццё - прыклад сама-ахвярнай адданасці Радзіме, смеласці і працавітасці. «Сіла - у праўдзе, у адзінстве, у вернасці сваім ідэалам» – гэтыя словы П. М. Машэрава актуальныя і сёння.

Памяць аб ім непадуладна часу, яго імя і сёння ўсяляе надзеі, умацоўвае сілы і веру ўсіх сумленных людзей. У Віцебску установлены помнік Машэраву. Яго імем названы праспект у Мінску, вуліцы ў Глыбокім, Давыд-Гарадку, Жыткавічах, Лідзе, Дзятлаве, Краснаполлі, Кобрыне і іншых населеных пунктах Беларусі. Праспект у Цэнтральным раёне Мінска атрымаў імя П. М. Машэрава ў 1980 годзе, на доме № 13 (вул. Чырвонаармейская), дзе ён жыў, знаходзіцца мемарыяльная дошка.

# Вуліца ПАНФІЛАЎЦАЎ






Вуліца Панфілаўцаў названа ў гонар доблесных воінаў 8-й гвардзейскай стралковай дывізіі імя Героя Савецкага Саюза (1942), генерал-маёра **Івана Васільевіча Панфілава**, якія гераічна змагаліся супраць фашысцкіх войск у час Маскоўскай бітвы 1941-1942 гадоў у Вялікую Айчынную вайну.

…Найважнейшай падзеяй першага года Вялікай Айчыннай вайны стала гістарычная бітва пад Масквой. Гітлераўскае камандаванне рабіла асаблівую стаўку на захоп сталіцы нашай Радзімы. На подступах да Масквы былі сканцэнтраваны галоўныя сілы нямецка-фашысцкай арміі. Аднак перавага ворага і ў жывой сіле, і ў тэхніцы не зламала баявога духу абаронцаў сталіцы. Масква ператварылася ў нязломную крэпасць.

Адна з межаў абароны сталіцы праходзіла каля чыгуначнага раз'езда Дубасекава. Ён апынуўся на напрамку галоўнага ўдару гітлераўцаў. Фашысты разлічвалі прарваць на гэтым участку абарону, вырвацца на Валакаламскую шашу і рушыць да Масквы.

Тут 16 лістапада група знішчальнікаў танкаў 1075-га стралковага палка 316-й стралковай дывізіі генерала І. В. Панфілава здзейсніла свой бесмяротны подзвіг. У час чарговага наступлення праціўніка на Маскву каля раз’езда Дубасекава 28 байцоў 4-й роты 2-га батальёна 1075-га стралковага палка на чале з малодшым палітруком В. Г. Клачковым адбівалі атакі праціўніка.

Палітрук В. Г. Клачкоў звярнуўся да байцоў са словамі, якія пасля назаўжды ўвайшлі ў гісторыю: «Велика Россия, а отступать некуда — позади Москва!». Сам цяжка паранены, ён са звязкам гранат кінуўся пад варожы танк і падарваў яго. Чатыры гадзіны працягваўся гэты легендарны бой. 18 танкаў і дзясяткі салдат страціў тут вораг, але прарваць абарону яму так і не ўдалося. Амаль усе абаронцы загінулі. Байцы 4-й роты цаной свайго жыцця далі магчымасць нашым войскам падцягнуць рэзервы, заняць зручныя пазіцыі і годна сустрэць ворага.

Легендарным подзвігам панфілаўцы на ўвесь мір праславілі стойкасць і бястрашша савецкіх салдат. 21 чэрвеня 1942 года ўдзельнікам гэтага бою было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У дні святкавання 30-годдзя Перамогі ля раз'езда Дубасекава быў адкрыты велічны мемарыяльны комплекс - народ увекавечыў подзвіг 28 герояў-панфілаўцаў. Над ратным полем ва ўвесь рост са зброяй у руках усталі

высечаныя з каменя фігуры воінаў. Іх твары звернуты ў бок, адкуль лавінай ішлі фашысцкія танкі. За спінамі байцоў - Масква, якую яны захавалі коштам уласнага жыцця. Гэты помнік бачны здалёк, яго маштабы проста ўражваюць. У падножжа Герояў Панфілаўцаў размешчана гранітная памятная пліта, на якой высечаны наступныя словы: «*Защищая Москву в суровые ноябрьские дни 1941 года на этом рубеже в жестокой схватке с фашистскими захватчиками стояли насмерть и победили 28 героев-панфиловцев*».



Подзвіг 28 герояў-панфілаўцаў увайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны як выдатны прыклад гераізму, стойкасці, самаахвярнай любові савецкіх людзей да сваёй Радзімы.



*Вуліца Панфілаўцаў*

# Вуліца РАКАСОЎСКАГА




Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 118 ад 26 сакавіка 2010 года на карце Кобрына з'явілася вуліца Ракасоўскага. Знаходзіцца ў новым квартале жылой забудовы ў раёне былога аэрадрома ў г. Кобрыне.



**Ракасоўскі Канстанцін (Ксавер'евіч) Канстанцінавіч (21.12.1896 – 03.08.1968) – ваенны дзеяч, палкаводзец, удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Маршал Савецкага Саюза і Польшчы, двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945).**

**Узнагароджаны ордэнам «Перамога», 7 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 6 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава I ступені, Кутузава I ступені, Ганаровай зброяй, дзяржаўнымі ўзнагародамі замежных краін.**

Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі ў сваіх аўтабіяграфіях згадваў, што нарадзіўся 21 снежня 1896 года ў Варшаве, пазней — г. Вялікія Лукі ў Расіі. У 2021 годзе на сваім афіцыйным сайце супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі апублікавалі запіс з метрычнай кнігі Целяханскай царквы пра нараджэнне і хрышчэнне Канстанціна. Запіс быў адшуканы ўраджэнцам в. Соміна Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці Уладзімірам Міхайлавічам Абрамчуком.

Як сведчаць архіўныя дакументы, хлопчык Канстанцін, сын двараніна Ксаверыя Вікенцьевіча Ракасоўскага, рымска-каталіцкага веравызнання, і яго жонкі Антаніны Іванаўны, праваслаўнага веравызнання, нарадзіўся 3 (15) верасня 1889 года, а 4 (16) 1889 года быў ахрышчаны ў Свята-Троіцкай царкве ў Целяханах. Атрымліваецца, Канстанцін Канстанцінавіч (Ксавер'евіч) Ракасоўскі быў на пяць ці нават на сем гадоў старэйшым, чым гэта было занатавана ў яго пазнейшых дакументах.

Яго бацька, Ксаверый Юзаф Красоўскі (1853–1902), са старажытнага польскага роду, служыў рэвізорам на чыгунцы. Маці, Антаніна Аўсяннікава, паходзіла з мяшчан Пінскага павета, настаўніца рускай мовы, пахавана ў мястэчку Целяханы (цяпер Івацэвіцкі раён).

Канстанцін Ракасоўскі служыў у Рускай арміі з пачатку Першай сусветнай вайны, удзельнічаў у баях пад Варшавай, у Літве. На фронце зблізіўся з рэвалюцыянерамі. У Чырвонай арміі са жніўня 1918 года — камандзір эскадрона 1-га Уральскага кавалерыйскага палка. У грамадзянскую вайну служыў на Усходнім фронце — у Забайкаллі і Манголіі.

Закончыў курсы ўдасканалення камсаставу кавалерыі (1925), вышэйшага начсаставу пры Ваеннай акадэміі імя М. Фрунзэ (1929).

У 1930–1932 гадах К. Ракасоўскі жыў і служыў у Мінску. Да 1941 года — камандзір палка, брыгады, дывізіі, корпуса. У перыяд з 17 жніўня 1937-га па 22 сакавіка 1940 года знаходзіўся пад следствам у Ленінградскай турме, абвінавачваўся ў сувязях з замежнымі разведкамі. Быў вызвалены і адноўлены ў званні, назначаны ў Кіеўскую асобую ваенную акругу. Удзельнічаў ў вызваленчым паходзе ў Бесарабію.

У Вялікую Айчынную вайну К. К. Ракасоўскі камандаваў корпусам, арміяй. З ліпеня 1942 года — камандуючы войскамі Бранскага, з верасня 1942 года — Данскога, з лютага 1943 года — Цэнтральнага, з кастрычніка 1943 года — Беларускага, з лютага 1944 года — 1-га Беларускага, з лістапада 1944 года — 2-га Беларускага франтоў. З 29 чэрвеня 1944 года — Маршал Савецкага Саюза. Войскі пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага ўдзельнічалі ў абароне Масквы, у Сталінградскай і Курскай бітвах, Беларускай аперацыі 1944 года, Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай аперацыях, Берлінскай аперацыі 1945 года.

Як камандуючы 1-м Беларускім фронтам К. К. Ракасоўскі ўнёс значны ўклад у правядзенне Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944), паклаў пачатак вызваленню Польшчы.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны К. К. Ракасоўскі — галоўнакамандуючы Паўночнай групай войск. Камандаваў

парадам Перамогі, які прымаў Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў (24 чэрвеня 1945).

З 1949 года быў міністрам нацыянальнай абароны, намеснікам Старшыні Савета Міністраў Польскай Народнай Рэспублікі, членам Палітбюро ЦК ПАРП і дэпутатам сейма. З 1956 года — намеснік міністра абароны СССР, галоўны інспектар Міністэрства абароны СССР, камандуючы войскамі ваеннай акругі. З 1962 года на адказных пасадах у Міністэрстве абароны СССР.

У 1964 годзе К. К. Ракасоўскі ўдзельнічаў у святкаванні 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у Мінску.

Аўтар мемуарных твораў «Непакораная Беларусь» (1963), «Сталінградская эпапея» (1968), «Курская бітва» (1970) і інш.

Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі памёр 3 жніўня 1968 года, пахаваны на Чырвонай плошчы ў Маскве.

У гарадах Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці, Курску, Гомелі ўстаноўлены бюсты К. К. Ракасоўскага. Яго імем названы Далёкаўсходняе ваеннае вучылішча, вуліцы ў Маскве, Мінску, Брэсце, Баранавічах, Пінску, Івацэвічах, Жабінцы, Кобрыне і інш. У Брэсце ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць штаба 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага, які знаходзіўся тут у 1944 годзе. 8 мая 2010 года ў Брэсце адкрыта мемарыяльная дошка К. К. Ракасоўскаму (вул. Ракасоўскага, 6).

# Вуліца ВЕРЫ ХАРУЖАЙ




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 83 ад 11 сакавіка 1966 года новаму завулку ў раёне вуліцы Горкага было прысвоена імя Веры Харужай. З 2008 года завулак перайменаваны ў вуліцу Веры Харужай (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008). Знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.



**Харужая Вера Захараўна (27.09.1903 – 04.12.1942) – дзеяч рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля ў Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны, публіцыст, Герой Савецкага Саюза (1960).**

Нарадзілася 14 (27) верасня 1903 года ў г. Бабруйску Мінскай губерніі (цяпер Магілёўскай вобласці), але дзяцінства яе прайшло ў горадзе Мазыр, дзе яна ў 1919 годзе закончыла Мазырскую адзіную працоўную школу 2-й ступені. Настаўнічала на Палессі. З'яўлялася ўдзельніцай грамадзянскай вайны 1918–1920 гадоў, калі тэрыторыя Мазыра была акупіравана польскімі войскамі, бандамі белагвардзейскага генерала Булак-Балаховіча – аднаго з лідараў барацьбы супраць савецкай улады.

У 1920 годзе Вера Харужая ўдзельнічала ў антыпольскім партызанскім руху. З 1921 года – член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Два гады, з 1921 года па 1923 год, В. З. Харужая вучылася ў Цэнтральнай савецка-партыйнай школе ў Мінску. Працавала ў Мазырскім і Бабруйскім павятовых камітэтах Камуністычнага саюза моладзі Беларусі загадчыцай палітычна-асветнага аддзела, затым – у апараце Цэнтральнага камітэта камсамола. У гэты ж час з'яўлялася супрацоўнікам маладзёжных газет «Юны араты», «Чырвоная змена», часопіса «Полымя», а яшчэ працавала выхавальніцай Дома юнацтва і Камсамольскай камуны ў Мінску.

Пасля заканчэння партыйнай школы пачынаецца новая старонка ў біяграфіі Веры Харужай. З лютага 1924 года В. З. Харужая накіроўваецца на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь, якая на той час уваходзіла ў склад Польскай дзяржавы. З чэрвеня 1924-га – сакратар ЦК КСМЗБ, член ЦК КПЗБ. Выступала ў нелегальным друку, на мітынгах, стварала тэксты лістовак. Арганізавала выданне падпольнай газеты КСМЗБ «Малады камуніст».

Пачатак яе дзейнасці адзначыўся хуткім ростам камсамольскіх арганізацый, асабліва ў вёсках. Энергічная, адданая выбранай справе Вера Захараўна аб'ядноўвала моладзь вакол камсамола, выступала на мітынгах і ў нелегальным друку, праводзіла падпольныя сходы і нарады рэвалюцыйнай моладзі, стварала падпольныя камсамольскія арганізацыі. З мэтай удзелу ў канферэнцыях і для ўладкавання сувязей яна пабывала ў Брэсце, Гродне, Пінску, Пружанах і іншых гарадах.

Аднак польскія ўлады выкрылі дзейнасць апантанай барацьбіткі. 15 верасня 1925 года яна была арыштавана ў Беластоку і прыгаворана да шасці гадоў зняволення. Але гэта быў толькі пачатак яе пакутаў. З 17 красавіка па 29 мая 1928 года ў Беластоку праходзіў «працэс 133» – адзін з самых масавых працэсаў у гісторыі рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі. У ліку абвінавачаных была і Вера Захараўна, якой тады прысудзілі яшчэ восем гадоў зняволення з адбыццём у жаночай катаржнай турме «Фордан» на захадзе Польшчы. Будучы ў няволі, яна пісала пісьмы родным, сябрам, частка якіх склала кнігу «Пісьма на волю». За заслугі ў рэвалюцыйным руху В. З. Харужая ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР.

У верасні 1932 года ў выніку абмену палітычнымі вязнямі Вера Харужая вярнулася ў Мінск. На Радзіме яна актыўна займалася публіцыстычнай дзейнасцю. Для выдавецтва ЦК КПЗБ пісала артыкулы, брашуры. Завяршыла пачатыя ў турме публіцыстычныя брашуры «За Чырвоны Кастрычнік на Заходняй Беларусі», «Мы – маладая гвардыя рабочых і сялян», «Увага, школьнікі»

(выдадзены ў 1933 годзе на беларускай, украінскай і польскай мовах).

У 1935 годзе выключана з партыі па даносе мужа Станіслава Скульскага (Мертэнса). Арыштавана органамі НКУС 10 жніўня 1937 года. Два гады знаходзілася ў Мінскай унутранай турме НКУС. Вызвалена 15 жніўня 1939 года.

Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР Вера Захараўна працавала ў Пінскім абласным камітэце партыі.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны В. З. Харужая стала партызанкай першага арганізаванага на тэрыторыі Беларусі партызанскага атрада Васіля Захаравіча Каржа.

З вясны 1942 года яна ў апараце ЦК КП(б)Б у Маскве. У верасні таго ж года, кіруючы групай з 17 чалавек, накіравана ў Віцебск для арганізацыі ўмацавання Віцебскага патрыятычнага падполля. Яна збірала і перадавала камандаванню Чырвонай арміі і партызанам каштоўныя звесткі пра ворага. 13 лістапада 1942 года Вера Харужая разам са сваімі баявымі таварышамі была арыштавана нямецкімі фашыстамі і пасля жорсткіх катаванняў расстраляна.

Імя непакоранай Веры Харужай жыве ў памяці людзей. У гарадах і вёсках Беларусі ў яе гонар названы вуліцы, плошчы, яе імя прысвоена ўстановам адукацыі і музеям у школах, ёй усталяваны помнікі і мемарыяльныя дошкі.

У 1960 годзе В. З. Харужай было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

# Вуліца ЧАРНЫШОВА




Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 222 ад 26 кастрычніка 1979 года новай вуліцы ў г. Кобрыне прысвоена імя Героя Савецкага Саюза В. Я. Чарнышова. З 2008 года – вуліца Чарнышова (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).



**Чарнышоў Васілій Яўхімавіч (26.08.1908 – 12.11.1969) – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр (1943), Герой Савецкага Саюза (1944).**

Нарадзіўся 26 жніўня 1908 года ў сяле Краснае Лівенскага павета Арлоўскай губерні (Расія) у беднай сялянскай сям'і. З 13 гадоў пачаў працаваць на Троіцкім заводзе, затым на чыгуначнай станцыі Бранск. У 1926 годзе прызваны ў Чырвоную армію, у 1927 годзе закончыў Арлоўскае ваеннае пяхотнае вучылішча і неўзабаве дэмабілізаваўся, быў накіраваны на вучобу. У 1930 годзе закончыў Бранскі камуністычны ўніверсітэт, знаходзіўся на камсамольскай рабоце ў Бранску, Клінцах, Благавешчанску.

У 1935 годзе Васілій Чарнышоў пераведзены ў Беларусь — працаваў у Полацку першым сакратаром Полацкага акружкама ЛКСМБ. З 1937 года — першы сакратар Жлобінскага райкама КП(б)Б Гомельскай вобласці, са студзеня 1940 года — першы сакратар Васілішкаўскага райкама КП(б)Б Баранавіцкай вобласці, з сакавіка 1941 года — сакратар Баранавіцкага абкама КП(б)Б па транспарце.

У ліпені 1941 года В. Я. Чарнышоў накіраваны ў Полацкі раён Віцебскай вобласці для арганізацыі партызанскага руху і камуністычнага падполля. Арганізаваў партызанскую групу, якая восенню 1941 года вырасла да атрада ў колькасці каля 100 чалавек (камандзір Я. М. Дзюрба). У сакавіку 1942 года В. Я. Чарнышова адазвалі ў Маскву, дзе ён рыхтаваўся да падпольнай работы ў тыле ворага.

З 1942 года — упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху па Баранавіцкай вобласці. На акупіраваную тэрыторыю В. Я. Чарнышоў з групай партработнікаў прыбыў самалётам 18 сакавіка

1943 года. З 19 сакавіка 1943 года — сакратар Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б, адначасова з красавіка 1943 года — камандзір Баранавіцкага партызанскага злучэння.

Ужо ў першым паўгоддзі 1943 года ў многіх раёнах Баранавіцкай вобласці стварыўся вызвалены партызанскі край. У сярэдзіне 1943 года партызаны падарвалі і захапілі восем варожых эшэлонаў са зброяй, што дало магчымасць узброіць 12 тысяч чалавек. У ліпені больш за месяц змагаліся з франтавымі і карацельнымі войскамі СС, якія былі кінуты на іх знішчэнне ў Налібоцкай пушчы. У верасні ў ходзе аперацыі «Канцэрт» партызаны падарвалі 9 тысяч рэек, чатыры вялікія чыгуначныя масты, разбілі сем станцый, разграмілі 12 нямецкіх гарнізонаў.

16 верасня 1943 года В. Я. Чарнышову прысвоена воінскае званне генерал-маёр. 1 студзеня 1944 года ён удастоены ганаровага звання «Герой Савецкага Саюза». На чэрвень 1944 года ў Баранавіцкай вобласці дзейнічалі 26 партызанскіх брыгад і восем асобных атрадаў агульнай колькасцю 30 тысяч партызан.

Пасля вызвалення Беларусі В. Я. Чарнышоў знаходзіўся на адказнай партыйнай рабоце. З 20 ліпеня 1944-га па кастрычнік 1946 года — другі сакратар Баранавіцкага абкама КП(б)Б. Першы сакратар Брэсцкага абкама КП(б)Б з кастрычніка 1946-га па снежань 1948 года. У першыя пасляваенныя гады галоўнай задачай кіраўніцтва Баранавіцкай і Брэсцкай абласцей было аднаўленне разбуранай гаспадаркі.У 1948–1950 гадах В. Я. Чарнышоў — першы сакра-тар Мінскага абкама КП(б)Б. З чэрвеня 1950-га па ліпень 1951 года працаваў сакратаром ЦК КП(б)Б.

У 1951–1959 гадах — першы сакратар Калінінградскага абкама партыі. Васілій Яўхімавіч шмат зрабіў для станаўлення Калінінградскай вобласці. Мясцовага насельніцтва там не засталося, трэба было асвойваць тэрыторыю сіламі перасяленцаў, вяртаючы да жыцця палі, заводы.

Потым В. Я. Чарнышоў быў накіраваны на другі край СССР — на Далёкі Усход. У 1959–1969 гадах — першы сакратар Прыморскага крайкама КПСС. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны генеральны план Уладзівастока, пры яго непасрэдным удзеле ва Уладзівастоку з'явіліся акадэмгарадок, Далёкаўсходні педагагічны інстытут, тэхналагічны інстытут бытавога абслугоўвання.

На XIX, XX, XXII і XXIII з'ездах КПСС В. Я. Чарнышоў выбраны членам ЦК, на XIX з'ездзе КП(б)Б — членам ЦК. Член Бюро ЦК КП(б)Б (1949–1951). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР III–XII скліканняў (1950–1969).

Аўтар кніг «Связь с массами — основа партийной работы» (1963), «Орденоносное Приморье» (1967), артыкулаў аб партызанскай барацьбе ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Васілій Яўхімавіч узнагароджаны шасцю ордэнамі Леніна, ордэнамі Суворава I ступені (1944), Чырвонай Зоркі (1942), Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

У 1969 годзе быў назначаны намеснікам старшыні Камітэта партыйнага кантролю пры ЦК КПСС.

Васілій Яўхімавіч Чарнышоў памёр 12 лістапада 1969 года, пахаваны на Новадзявочых могілках г. Масквы.

Яго імем у Баранавічах у 1970 годзе названы тэхнікум лёгкай прамысловасці, устаноўлена мемарыяльная дошка; у Баранавіцкім раёне ў в. Петкавічы ў 1979 годзе названа вуліца, устаноўлена мемарыяльная дошка.

# Вуліца ЯГОРАВА




У 1964 годзе да 20-годдзя вызвалення г. Кобрына па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 177 ад 17 чэрвеня завулак Лугавы перайменаваны ў завулак імя Ягорава. З 2008 года – гэта вуліца Ягорава (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 32 ад 18.09.2008).

На адным з дамоў на гэтай вуліцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.





**Ягораў Сяргей Ягоравіч (1901 – 11.06.1944) –адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

Нарадзіўся ў 1901 годзе ў пасёлку Удзельная Раменскага раёна Маскоўскай вобласці. Член ВКП(б) з 1920 года.

У Чырвонай Арміі служыў з 1920-га па 1924 год, два гады з якіх ваяваў на франтах грамадзянскай вайны. У 1921 годзе ўдзельнічаў у падаўленні Кранштацкага мецяжу.

У 1936 годзе Сяргей Ягораў быў абраны першым сакратаром Ягор'еўскага райкама партыі Маскоўскай вобласці.

У 1938 годзе па партыйнай мабілізацыі прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Батальённы камісар Ягораў прымаў удзел у савецка-фінляндская вайне 1939—1940 гадоў. За гэтую кампанію атрымаў першую баявую ўзнагароду - ордэн Чырвонай Зоркі.

Вялікую Айчынную вайну сустрэў у Брэсцкай вобласці на пасадзе намесніка камандзіра па палітчасці 15-га стралковага палка 49-й стралковай дывізіі. У няроўных баях першых дзён вайны часць была разбіта.

Апынуўшыся ў акружэнні ў Белавежскай пушчы, С. Я. Ягораў уключыўся ў антыфашысцкую барацьбу. У ліпені 1942 года ён быў адным з арганізатараў разгрому варожага гарнізона ў Косаве. Пазней партызаны перабраліся ў Пінскую вобласць.

С. Я. Ягораў - камісар асобнага партызанскага атрада імя Чапаева (снежань 1942 - сакавік 1943), які пазней увайшоў у брыгаду імя Леніна Пінскага злучэння. Камісар асобнага атрада імя Шчорса (люты-красавік 1943).

Удзельнічаў у арганізацыі міжраённага камітэта барацьбы з акупантамі, які ў 1943 годзе быў рэарганізаваны ў Брэсцкі антыфашысцкі камітэт. З красавіка 1943 года С. Я. Ягораў прызначаны намеснікам упаўнаважанага па партыйна-масавай рабоце Беларускага штаба партызанскага руху і ЦК КП(б)Б па Брэсцкай вобласці.

Сяргей Ягоравіч Ягораў загінуў 11 чэрвеня 1944 года пры пералёце праз лінію фронту. Медаль «Партызану Айчыннай вайны» І ступені ў 1948 годзе перададзены сям'і.

# СПІС КРЫНІЦ

**Твои сыновья, Беларусь!** Герои Советского Союза : биографический справочник. – Минск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2015. – 376 с : ил.

**Долготович, Б. Д.** Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : Беларусиь, 2008. – 368 с. : ил.

**Памяць. Кобрынскі раён** : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 624 с. : іл.

**Герои Советского Союза** : краткий биографический словарь : в 2 т. / Министерство обороны СССР, Главное управление кадров, Институт военнной истории, Центральный архив ; [А. А. Бабаков (руководитель) и др.] ; редколлегия: И. Н. Шкадов (председатель) [и др.]. - Москва : Военное издательство, 1987—1988. - Т. 1 : Абаев — Любичев. - 1987. - 909, [2] с., портр.

**Герои Советского Союза** : краткий биографический словарь : в 2 т. / Министерство обороны СССР, Главное управление кадров, Институт военнной истории, Центральный архив ; [А. А. Бабаков (руководитель) и др.] ; редколлегия: И. Н. Шкадов (председатель) [и др.]. - Москва : Военное издательство, 1987—1988. - Т. 2 : Любов — Ящук. - 1988. - 862, [1] с. портр

**Их именами названы**… : энциклопедический справочник. – Минск : Белорусская Советская Энциклопедия имени Петруся Бровки, 1987. – 711 с. : ил.

**Навечно в сердце народном**. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Главная редакция Белорусской Советской Энциклопедии, 1977. – 520 с. : портр.

**Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны** : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – 200 с.

**Імёны землякоў – вуліцам горада** : краязнаўчы буклет / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук ; дызайн: П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – С. 11-14 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны». – 2-е выд., дап. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 25-27 : фат.

**Залатая зорка Кобрына** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2019. - 28 с. : іл. – (Серыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы»).

**Імёны тваіх вуліц, горад Кобрын** : даведнік-тур па вуліцах да 730-годдзя з часу першага ўпамінання Кобрына / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2017. – 70 с. : фат. – (Серыя «Ведай і любі свой горад»).

**Яны вызвалялі наш горад** : бібліяграфічны летапіс да 70-годдзя вызвалення г. Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ; аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. – Кобрын, 2014. - 38 с. : фат.

**Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых** : даведнік па вуліцах Кобрына, якія носяць імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2004. – 24 с. : фат.

**Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых** : дадатак да даведніка па вуліцах Кобрына, якія носяць імены ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2005. – 6 с. : фат.

**О переименовании** элементов улично-дорожной сети города Кобрина : решение Кобринского районного Совета депутатов, 26 июня 2024 г., № 19 // Кобрынскі веснік. – 2024. – 20 ліпеня (№ 29). – С. 7.

О переименовании улицы Калиновского на улицу Петра Машерова.

**Елизарова, Ж.** В память об огненном таране / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2024. — 27 студзеня (№ 4). — С. 15 : фот.

На Кобринщине именем героя Н. Ф. Гастелло названы одна из улиц в Кобрине и агрогородке Повитье.

**Елизарова, Ж.** В честь легендарного комбрига / подготовила Жанна Елизарова по материалам сайта peramoga.belta.by и Википедии // Кобрынскі веснік. - 2024. — 17 лютага (№ 7). — С. 14 : фот.

Именем Героя Советского Союза Константина Заслонова названа одна из улиц в г. Кобрине.

**Елизарова, Ж.** Принял мученическую смерть / Жанна Елизарова ; по материалам библиотеки Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова // Кобрынскі веснік. – 2024. – 8 чэрвеня (№ 23). - С. 7 : фот. – (На карте города героев имена).

О Павле Гетмане, именем которого названа улица в г. Кобрине.

**Елизарова, Ж.** Бессмертная вера в бессмертный народ / подготовила Жанна Елизарова по материалам сайта www.warmuseum.by. // Кобрынскі веснік. - 2024. — 18 мая (№ 20). — С. 13 : фот.

Одна из улиц г. Кобрина названа в честь Героя Советского Союза Веры Хоружей.

# ЗМЕСТ

**Ад складальніка** 3

**Не згасне агонь памяці**: памяць аб героях, імёны якіх звязаны з Кобрынам, ушанаваная ў назвах вуліц 5

Вуліца Гетмана 6
Вуліца Данілеўскай 8
Вуліца Заморына 10
Вуліца Кірмановіча 16
Вуліца Краўчука 20
Вуліца Марозава 22
Вуліца Настасіча 25
Вуліца Пуганава 30
Вуліца Сандалава 34
Вуліца Сурына 37

**На карце горада герояў імёны** 40

Вуліца Гастэла 41
Вуліца маршала Жукава 43
Вуліца Заслонава 46
Вуліца Зоі Касмадзям’янскай 49
Вуліца Алега Кашавога 52
Завулак Кіжаватага 55
Вуліца Матросава 58
Вуліца Пятра Машэрава 61
Вуліца Панфілаўцаў 65
Вуліца Ракасоўскага 68
Вуліца Веры Харужай 72
Вуліца Чарнышова 76
Вуліца Ягорава 80

**Спіс крыніц** 83

Даведачнае выданне

# Вуліцы подзвігу і славы

ДАВЕДНІК
па вуліцах Кобрына, якія носяць імёны герояў –
удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны

На беларускай, рускай мовах

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная падрыхтоўка выдання: С. Д. Курачук

Мастацкае афармленне вокладкі: П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай тэхніцы
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, Кобрын
Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by